III З'ЕЗД БНФ

Амаль два гады не быў я ў Беларусі. Пасля таго, калі ў 1991 г. прыйшлося мне прасядзець перад таможняй у Гродне амаль 30 гадзін, цяжка было рашыцца на чарговую вандроўку за „керзанскую" мяжу. Едучы па запрашэнню Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" на яго III З'езд, спадзяваўся я, што шмат чаго змянілася ў Беларусі. Упершыню зрэшты ехаў я ў фармальна суверэнную дзяржаву, якая, пасля шматгадовага перыяду каланіялізму, была аб'яўлена вольнай і незалежнай. Без праблемаў удалося перасячы мяжу, хаця мытнікі доўга чыталі польскія газеты і „Ніву", якія мы з Алегам Латышонкам везлі ў Нацыянальную бібліятэку ў Мінску і для сяброў Сакрата Яновіча.

Сталіца Беларусі робіць уражанне на тых, якія прыязджаюць туды з такіх невялікіх гарадоў, як Беласток. Мінск, які налічвае толькі нямнога больш чым 2 мільёны жыхароў, здаецца быць гігантам. Шырокія з выбоінамі вуліцы, сталінскі, цяжкі стыль будаўніцтва ў цэнтры і лёгкія, высокія, шматпавярховыя блокі на ўскраінах горада. Сталіца, так як і кожны іншы горад на тэрыторыі Беларусі, выглядаў бы зусім інакш, каб нехта на сцены будынкаў паклаў нейкія іншыя, каляровыя тынкі, забараніў ездзіць кашмарным грузавікам, за якімі цягнуцца заўсёды хмары чорнага дыму, нешта памыў, штосьці памаляваў. Такая касметыка патрэбная магазінам, крамам, рэстаранам, гатэлям. Уваходзіць, напрыклад, пакупнік у магазін з харчовымі прадуктамі і ўжо сам пах адкідае чалавека. Сцены ў краме ў нейкіх кашмарных колерах, выгляд тавараў не заахвочвае купляць, і на дадатак — нейкая ідыятычная сістэма продажу. Спярша трэба ісці ў касу, там сказаць, які тавар і ў якой колькасці хочаш купіць. Заплаціўшы, можна ўрэшце стаць у чаргу за прадуктамі. Такую сістэму маглі прыдумаць толькі ў краіне, якая мае невялікія колькасці прадуктаў і ў якой ніхто не зацікаўлены масавым спажываннем. Пасля некалькіх гадзін пабыўкі ў Мінску

я дайшоў да вываду, што ў матэрыяльнай сферы жыцця на працягу двух гадоў змяніліся тут толькі цэны і паказалася новая беларуская валюта „зайчыкі".

Ідучы ў Дзяржаўны тэатр імя Янкі Купалы, дзе адбываўся III З'езд БНФ, спадзяваўся я, што, пэўна, змяніліся людзі. І сапраўды, відаць прынамсі вонкавыя змены. Валя Тругубовіч (кіраўнік камісіі БНФ па замежных справах) пасля сваіх „voyages" па Згнілым Захадзе памаладзела недзе на гадоў 20, Валеры Буйвал, малады чалавек, які ведае, здаецца, усе еўрапейскія мовы і некалькі іншых, чамусьці пасівеў. Так больш-менш змяніліся і ўсе іншыя знаёмыя і сябры.

III З'езд БНФ сарганізаваны быў у тым самым будынку, у якім II Усебеларускі кангрэс пачаў працэс змагання за незалежнасць і сваю дзяржаву. Амаль 600 дэлегатаў, натоўп журналістаў, дзесяткі запрошаных гасцей не маглі памясціцца ў зале Тэатра імя Янкі Купалы, але, як сказаў лідэр БНФ Зянон Пазьняк, „у 1917 г. было тут амаль 1990 дэлегатаў. Яны ўжо не стаялі на каленях і таму маглі ўсе памясціцца ў гэтай зале".

Пасля гімна „Магутны Божа" першы голас узяў пісьменнік і вялікі маральны аўтарытэт Беларусі Васіль Быкаў. Сказаў ён, што пару гадоў таму беларуская нацыя дайшла амаль да стану ліквідацыі свае тоеснасці. Імперыя адабрала ўсё: зямлю, мову і душу народа. „Толькі Бог не дапусціў да нашай цалкавітай смерці" — гаварыў Васіль Быкаў.

Галоўнае выступленне З. Пазьняка пачалося з напамінку таго часу, калі нараджалася апазіцыя ў Беларусі. Яна выступіла тады з бел-чырвона-белым сцягам і Пагоняй як нацыянальнымі сімваламі. У тэлебачанні называлі тады гэтыя сімвалы фашысцкімі, а за значок з Пагоняй, прышпілены да вопраткі, цягнулі ў суд. Цяпер, дзякуючы намаганням БНФ, бел-чырвона-белы сцяг вісіць над будынкам урада і парламента. Далей лідэр Фронту прадставіў палітычную сітуацыю ў Беларусі. Палітыка камуністычнай наменклатуры — сказаў Пазьняк — давяла народ да такой хваробы, пры якой нявольніцтва лічыцца згодным з натурай, ненармальнае лічыцца нармальным. Пануючая партакратыя мае адну мэту —

утрымацца пры ўладзе, каб бяскарна раскрадаць нацыянальную маёмасць. Яна становіцца групай капіталістаў і ўласнікаў. Трымаючы ў сваіх руках заканадаўчыя і выканаўчыя органы, яна не дапускае да ніякіх зменаў. За гарантыю ўлады камуністы гатовы ў любы момант аддаць айчыну пад маскоўскі пратэктарат. Пазьняк заявіў, што ніякага супрацоўніцтва з камуністамі не будзе, „бо гэта з маральнага пункту гледжання абазначала б тое самае, што супрацоўніцтва з бандытамі і злачынцамі".

Будучыню Еўропы Пазьняк бачыць як „Еўропу айчынаў". Моцна гэта супадае з лозунгамі ЗХНу, з такой, аднак, розніцай, што БНФ — гэта арганізацыя, якую складаюць праваслаўныя, каталікі, атэісты, баптысты і вернікі іншых канфесіяў. Падтрымоўваюць Фронт усе арганізацыі нацыянальных меншасцяў, апрача расійскай. Цяжка сабе ўявіць меншасць у Польшчы, якая падтрымоўвала б наш ЗХН.

Пазьняк у сваёй прамове вярнуўся да свае канцэпцыі Балта-чарнаморскай супольнасці (БЧС), якая яднала б Беларусь, Украіну, Літву і Латвію. Аказалася пасля, што гэтай ідэяй пачынаюць цікавіцца і ўспомненыя суседзі Беларусі. Прысутны на з'ездзе былы прэзідэнт Літвы Ландсбергіс, які раней рашуча адкідаў прапанову Пазьняка, пачаў у сваім выступленні гаварыць, што яна вельмі цікавая і варта над ёю задумацца. Лідэр украінскай апазіцыі, галоўны канкурэнт Л. Краўчука на прэзідэнцкіх выбарах, Чарновіл, назваў план БЧС найбольш аптымальным варыянтам для ўсіх еўрапейскіх краінаў, якія паўсталі пасля распаду СССР. Паводле Чарновіла, Беларусь павінна быць галоўным партнёрам Украіны, тым больш, што лёс абодвух народаў падобны і нішто іх не дзеліць ні гісторыя, ні сённяшні дзень.

На З'ездзе выступалі таксама лідэры Саюза палякаў Беларусі Т. Гавін і Б. Фустачэнка. Гаварылі прыгожа на беларускай мове. „Мы, палякі, — сказала Барбара Фустачэнка, — маем права і абавязак быць лаяльнымі да беларускага народа і нашай супольнай дзяржавы Беларусі. Не мусім быць лаяльнымі ў адносінах да урада, які прадстаўляе невядома каго. Адзінай дзяржаўнай мовай на Беларусі павінна быць

беларуская мова, усе іншыя — гэта мовы нацыянальных меншасцяў".

Удзельнікаў З'езда прывітаў ад Беларускага дэмакратычнага аб'яднання і іншых арганізацыяў, аб'яднаных у Беларускім саюзе ў Рэчы Паспалітай, старшыня БДА Алег Латышонак. Яго кароткае выступленне было вясёлай рэфлексіяй над нашай беларускай тоеснасцю і выклікала бурлівыя апладысменты дэлегатаў.

На другі дзень З'езд выбіраў Сойм БНФу, старшыню арганізацыі і яго намеснікаў. Лідэрам застаўся Зянон Пазьняк, а заступаць яго будуць: Валянцін Голубеў, Вінцук Вячорка, Юры Хадыка, Уладзімір Заблоцкі і Лявон Баршчэўскі. Падчас дыскусіі над зменамі ў праграме Фронту дайшло да падзелу сярод дэлегатаў — ці ўпісаць у статутную дзейнасць ахову хрысціянскіх вартасцей, ці яе не ўпісваць? Галасаванне справы таксама не вырашыла. 180 дэлегатаў было за, 130 супраць, астатнія не галасавалі ўвогуле. Пакуль што, праблему пакінулі на вырашэнне Сойму.

Ці зможа БНФ пераняць уладу на Беларусі? У будучыні напэўна так, бо падтрымоўваюць яго маладыя людзі, але на найбліжэйшых выбарах праўдападобна вялікіх поспехаў ён не даб'ецца, бо ненавідзяць яго ветэраны і пенсіянеры, якія найбольш дысцыплінавана пойдуць на выбарчыя ўчасткі. Старэйшыя людзі з сантыментамі ўспамінаюць брэжнеўскі „дабрабыт" і той час, калі кожныя пару гадоў давалі ім нейкі медаль, запрашалі на святкаванні, словам, шанавалі „савецкага чалавека". Фронт у іх вачах — сіла, якая збурыла „адзіны справядлівы лад", прывяла да развалу Савецкага Саюза. Сродкі масвай інфармацыі, якія астаюцца ў руках камуністаў, падтрымоўваюць усе міфы наконт БНФу.

Прыглядаючыся мінскім беларусам, я дайшоў да вываду, што маюць яны такія самыя псіхалагічныя праблемы, як і мы на Беласточчыне.

„Ніва" н-р 26 (1937) ад 27 чэрвеня 1993 г.

МЫ ВЫЙШЛІ ШЧЫЛЬНЫМІ РАДАМІ

Пяць сваіх вялікіх дзён мелі беларусы ў ліпені 1993 года. Хаця замежныя сродкі масавай інфармацыі амаль не звярталі ўвагі на тое, што рабілася ў Мінску ў днях 6-10 ліпеня, было гэта сапраўднае свята беларушчыны.

Каля тысячы прадстаўнікоў беларускіх асяроддзяў з усяго свету, ад Аргенціны да Чукоткі, з'ехаліся на Бацькаўшчыну. Некаторыя не бачылі роднай зямлі звыш 50 гадоў, іншыя нарадзіліся на чужыне. Першы з'езд беларусаў свету, арганізаваны Згуртаваннем беларусаў свету „Бацькаўшчына" і ўрадам Рэспублікі Беларусь, выклікаў з аднаго боку вялікае зацікаўленне замежных асяроддзяў, а з другога — небеспадстаўную падазронасць адносна мэтаў, якія паставілі сабе арганізатары. Апазіцыя, згуртаваная вакол Беларускага Народнага Фронту, ужо пару месяцаў таму назад заявіла, што з'езд гэты рыхтуецца наменклатурай з мэтай пераняць сімвалы ўлады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 1918 г. і такім чынам легітымізаваць сваё панаванне. Сем апазіцыйных партыяў рашылася тады арганізаваць III Усебеларускую палітычную канферэнцыю. Першая адбылася ў Чэшскай Празе ў 1921 г., пасля падпісання Рыжскага дагавора, а яе ўдзельнікі заклікалі беларусаў на барацьбу з акупантамі Бацькаўшчыны. Другая адбылася ў Берліне ў 1925 г. У выніку інтрыг НКУС давяла яна да падзелаў сярод эміграцыі, да кампраметацыі гэтага асяроддзя і да адабрэння некаторымі нацыянальнымі дзеячамі савецкай рэчаіснасці ў Беларусі.

Цяжка сказаць, якія мэты ставілі сабе арганізатары III Усебеларускай палітычнай канферэнцыі, якая пачалася 2 дні раней I З'езда беларусаў свету. Паводле таго, што адбылося ў Тэатры імя Янкі Купалы, можна меркаваць, што апазіцыя, карыстаючыся прысутнасцю дзеячоў з замежжа, хацела прадставіць палітычную рэчаіснасць у Беларусі са свайго пункту

гледжання і гэтым самым адпаведным спосабам „падрыхтаваць" гасцей да З'езда.

Зразумела, што некалькі соцень удзельнікаў канферэнцыі, з якіх большасць апынулася там зусім выпадкова, не магла выпрацаваць ніякай сэнсоўнай думкі, якая мела б істотнае значэнне для Бацькаўшчыны. Палітычны фальклор дамінаваў зрэшты не толькі на канферэнцыі, але таксама і падчас З'езда. Істотная, аднак, была тут атмасфера. Такой дэманстрацыі беларускага патрыятызму Мінск, здаецца, ніколі не бачыў. Паўсюдна чулася беларуская мова. Адраджэнне нацыі, мовы і культуры ўсе ўспрымалі як працэс, які немагчыма спыніць. Дэлегаты, асабліва падчас З'езда, расказвалі пра свае дасягненні ў змаганні за „Свабодную і Незалежную". Нават міністры пераадолелі саміх сябе і гаварылі так, як быццам бы не чулі іншай мовы апрача беларускай.

Вяртаючыся да Канферэнцыі трэба адзначыць, што адбывалася яна ў вельмі напружанай атмасферы. У гэтым самым часе працавала сесія „Вярхоўнага Савета", дзе абмяркоўваліся важныя праблемы для беларускай дзяржаўнасці, між іншым, пытанне рэферэндуму ў справе беларуска-расійскага ваеннага пагаднення. Дэпутаты ад БНФ маглі быць прысутнымі на канферэнцыі толькі падчас перапынкаў у пасяджэнні „Вярхоўнага Савета".

Адкрываючы Канферэнцыю намеснік старшыні БНФ Юры Хадыка паінфармаваў, што арганізатары запрасілі да ўдзелу ў яе працах толькі беларускія дэмакратычныя арганізацыі. Васіль Быкаў, вітаючы гасцей і дэлегатаў, звярнуў увагу, што на Беларусі, таксама як і ва ўсіх посткамуністычных дзяржавах, актывізуюцца рэакцыйныя сілы. Былая партыйная наменклатура спасылаецца на лозунгі абароны правоў чалавека, забыўшыся, што калі сама была пры ўладзе, пастаянна іх парушала. Тая ж наменклатура страшыць „карабахамі" і паказвае перспектыву вяртання таннай каўбасы, разлічвае перш за ўсё на люмпенпралетарскія асяроддзі.

Анатоль Сідарэвіч вярнуўся ў сваім дакладзе да 20-х гадоў XX стагоддзя, ацаніў дзве першыя канферэнцыі і заўважыў, што ў той час беларускія камуністы пераняли амаль усе на-

цыянальныя лозунгі дэмакратычных партыяў і спрабавалі іх увесці ў штодзённы ўжытак. Расійскія таварышы, якія перш за ўсё хацелі ўтрымаць імперыю, ніколі ім гэтага не забылі. Як першых паслалі іх у турмы і аддалі ў рукі чэкістаў.

Уся беларуская эміграцыя 1920-х гадоў была сацыялістычных арыентацыяў. Толькі ў трыццатых гадах, пад уплывам бальшавіцкай палітыкі, некаторыя памянялі свае погляды.

Янка Запруднік з ЗША выявіў найважнейшае для беларускай эміграцыі пытанні. Перш за ўсё — гэта праблема стаўлення да кіруючага дзяржавай урада: супрацоўнічаць з посткамуністычнымі міністрамі ці з тымі, што іх крытыкуюць? Які спосаб паводзін будзе лепшы для Беларусі і эміграцыі? Спадар Запруднік сказаў, што іншага выйсця няма. Беларусі пакуль што можна дапамагчы, падтрымоўваючы сувязі з існуючым урадам.

Лідэр БНФ Зянон Пазьняк прыпомніў, што над парламентам Беларусі вісіць бел-чырвона-белы сцяг, аднак у гэтым будынку амаль няма людзей, якія гавораць на беларускай мове, ёсць нават такія, што яе не разумеюць. У Польшчы, напрыклад, — гаварыў Пазьняк ні камуністам, ні тым больш фашыстам ніколі не прыйшло ў галаву ставіць прапанову ліквідацыі свае дзяржаўнасці. На Беларусі больш чым палова „народных дэпутатаў" адкрыта дамагаецца далучэння Бацькаўшчыны да Расіі. Гэтая большасць падтрымоўвае ўрад Кебіча, які — паводле лідэра БНФ — вядзе антыбеларускую палітыку. У апошніх гадах толькі адзін працэнт кніжак, якія выдаюцца на Беларусі, друкуюцца на роднай мове. Нават у апошніх гадах існавання БССР друкавалася іх звыш 4%. Замест беларускай арміі, — працягваў Пазьняк, — тут закансерваваны расійскія ўзброеныя сілы, а беларускіх афіцэраў пазбаўляюць працы.

Алег Трусаў — старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады ў сваім выступленні заўважыў, што ў гісторыі беларусаў найчасцей бывала так, што кожны мог нас падзяліць і выкарыстаць у сваіх інтарэсах.

Два даклады былі яшчэ прысвечаны прапановам канстытуцыйнага парадку на Беларусі. Пункт погляду БНФ у гэтай

справе прадставіў Валянцін Голубеў, а Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі — Аляксандр Дабравольскі.

На Беларусі думаецца цяпер пра ўсё — гаспадарку, канстытуцыйны парадак, замежную палітыку, культуру. Але гэта ёсць рух, які тычыцца толькі элітаў. Большасць людзей прывыкла, што хтосьці за іх вырашыць усе праблемы. Усё быццам бы таксама як і ў нас, на Беласточчыне.

„Ніва" н-р 30 (1941) ад 25 ліпеня 1993 г.

ВЯРТАННЕ

26 студзеня 1994 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь адклікаў свайго спікера, заадно выконваючага абавязы прэзідэнта дзяржавы, Станіслава Шушкевіча. Фармальна абвінавацілі яго ў тым, што не заплаціў ён нейкіх рахункаў за цвікі і дошкі, выкарыстаныя пры рамонце ягонай кватэры. Але гэта была зусім другарадная справа, бо таксама добра прагаласавалі б тады за адстаўку Шушкевіча з-за неадпаведнага колеру гальштука, у якім паявіўся ён на пасяджэнні Вярхоўнага Савета.

Усё паказвае на тое, што элімінацыя прэзідэнта не была выпадковай. Два дні раней камуністычныя дэпутаты пазбавілі пастоў міністра ўнутраных спраў У. Ягорава і шэфа беларускага КДБ Э. Шыркоўскага — палітыкаў, якія ва ўрадзе Беларусі падтрымоўвалі Шушкевіча ў яго змаганні за захаванне суверэнітэту дзяржавы.

Вярхоўны Савет, выбраны дзеля патрэбаў савецкай рэспублікі, не мог зусім выконваць заканадаўчыя функцыі парламента незалежнай краіны. Ён надалей працаваў (і працуе), як тыповая савецкая ўстанова. Большасць дэпутатаў — гэта калгасныя чыноўнікі, ветэраны вайны або сацыялістычнай працы, людзі з вельмі абмежаванымі магчымасцямі ўспрымання сучаснай рэчаіснасці. Іх час затрымаўся недзе ў 50-70-х гадах і нават гарбачоўская эпоха была ім ужо зусім незразумелай.

Невялікая жменька дэпутатаў бэнээфаўскай дэмакратычнай апазіцыі спачатку моцна палохала гэты былы авангард савецкага народа, але ў апошнім часе камуністы навучыліся жыць з гэтай апазіцыяй, татальна яе ігнаруючы. Дзень пасля перавароту, 27 студзеня, выконваючы часова абавязкі спікера Вячаслаў Кузняцоў звычайна адбіраў голас лідэру апазіцыі Пазьняку і ўсім дэпутатам ад БНФ, калі тыя спрабавалі весці палеміку з большасцю, захопленай сваёй перамогай. Вокамгненна ажыццявілася добра ўсім вядомая і спрактыкаваная дэпутатамі г.зв. сацыялістычная дэмакратыя, калі голас даецца толькі таму, хто будзе доўга дзякаваць і нічога непрадбачанага не скажа.

Незалежнасць Беларусь атрымала не таму, што хацелі яе кіруючыя дзяржавай мясцовыя камуністы. Яна ўпала на іх галовы як няшчасце. У сапраўднасці была вынікам змагання за ўладу ў Маскве паміж Ельцыным і Гарбачовым. Для Ельцына ў той момант, каб пазбавіць канкурэнта паста прэзідэнта Савецкага Саюза, трэба было разбурыць той жа Саюз. Калі характар улады ў Маскве больш-менш акрэслены, пачаўся працэс вяртання толькі што патрачаных Расіяй зон уплываў. Дзяржава, якая цяпер аднаўляецца, поўнасцю вяртаецца да традыцый і сімвалаў царскай імперыі. Адстаўка расійскіх рэфарматараў — Гайдара і Фёдарава — абазначае, што Расія хутчэй і больш рашуча будзе падпарадкоўваць свае былыя правінцыі, якія на працягу 23 гадоў існавалі як незалежныя дзяржавы. Пакуль пры ўладзе ў былых рэспубліках сядзяць старыя савецкія наменклатуршчыкі, а незалежнасць не мае эканамічнага замацавання, дагэтуль не будзе ніякіх праблемаў у вяртанні кантролю над новапаўсталымі дзяржавамі. Працэс гэты мог бы стрымаць толькі нейкі ўнутраны падзел імперыі, чаго, аднак, апрача жменькі расійскіх інтэлектуалаў, ніхто ў свеце не хоча.

Праўдападобна няма ў гэтых умовах ніякіх шанцаў захаваць незалежнасць Беларусі. Беларускі народ патраціў чарговы шанц, якім не часта абдароўвае нас гісторыя. Нявыкарыстаныя былі гэтыя апошнія чатыры гады для адраджэння нацыянальнай свядомасці, мовы, культуры, нацыянальнай год-

насці. Ашаломленае і стомленае эканамічнымі цяжкасцямі грамадства не дало ніякай падтрымкі дэмакратычнай апазіцыі, дазволіла на яе палітычную ізаляцыю, паверыла старым махлярам і перспектывам вярнуць крамы з танным салам, хлебам, цукеркамі і гарэлкай. Нешматлікай інтэлігенцыі не хапіла сіл пачаць працэс пераўтварэння гэтага савецкага грамадства ў беларускі народ.

Магчыма, што праз год адбудуцца парламенцкія ці нават прэзідэнцкія выбары, але будзе гэта толькі фармальнасць. На практыцы яны ўжо адбыліся ў студзені гэтага года.

„Ніва" н-р 7 (1970) ад 13 лютага 1994 г.

КУДЫ ІДЗЕ БЕЛАРУСЬ?

У днях 24 верасня 1994 г. у Беларусі былі арганізаваныя Дні беларускага пісьменства і друку. Цэнтральныя ўрачыстасці мелі адбыцца ў старажытнай сталіцы Беларусі — Полацку, горадзе Ефрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Васіля Цяпінскага і Сімяона Полацкага. З Польшчы запрашэнне на святкаванні ад Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына" атрымалі: Сакрат Яновіч, Ян Чыквін, Уладзімір Пац з беларускай секцыі Радыё „Палёнія" і ніжэйпадпісаны. Нагода пабачыць старажытную сталіцу Беларусі і яе помнікі архітэктуры была тым аргументам, які не пакідаў сумнення, што трэба усё адкласці і ехаць святкаваць.

Дзяржаўная мяжа!

У добрай кампаніі не адчуваліся цяжкасці начнога падарожжа рэйсавым аўтобусам Беласток—Мінск. Але жарты заўсёды канчаюцца на польска-савецкай мяжы. Не пішу беларускай, бо яна ўсё яшчэ савецкая. Першае слова, якое там пачулі — гэта „нельзя". Нейкія разлезлыя лейтэнанты і палкоўнікі пару гадзін даказвалі, што ў прапагандаванні дурнаты няма ў іх сур'ёзных канкурэнтаў. Мяжа — візітка дзяржаўнасці — засталася рэліктам саветчыны ў яе найгоршым выяўленні. Новае толькі ў тым, што долар стаў там адзіным

богам, заступіў права і маральнасць, вызначыў рытм працы мытнікаў і пагранічнікаў.

Суткі ў Мінску

Пры ўваходзе ў гатэль „Мінск" дзядзька, па выглядзе — маёр спецслужбаў, прывітаў словамі: „Таварышчы, месц нет". Калі ён даведаўся, што мы замежнікі, і маем „браніраваныя" месцы, ветліва запрасіў нас сесці ў фатэлі, а сам пабег будзіць змораных працай адміністратарак. Аказалася пасля, што палова пакояў у гатэлі пустуе. Савецкую логіку немагчыма, аднак, зразумець нармальнаму чалавеку. Яна відаць вышэй „всех и всего".

У сядзібе Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына" Ніна Петухова пазнаёміла нас з праграмай нашай пабыўкі. Шмат чаго не разумеем, але гэта пэўна з прычны недахопу сну і раптоўнай змены надвор'я. Ішоў густы дождж. З Валодзем Пацам вырашылі мы, аднак, парушыць рэжым дня і наведаць кнігарні. Мяне цікавіла перш за ўсё новая гістарычная літаратура. Але, на жаль, яе амаль не было. Старую камуністычную міфалогію дзесьці пахавалі, новую гістарыяграфію пакуль што яшчэ не стварылі, або не паспелі надрукаваць. Пару кніжак, пісаных на патрэбы навучальных устаноў, так у галіне тэрміналогіі, як і інтэрпрэтацыі фактаў, моцна напамінаюць савецкую школу аўтараў. Цэны кніжак проста сімвалічныя. За адзін долар можна купіць 5-6 акуратна пераплеценых кніг. Выдавецтвы зарабляюць на замежнай псеўдалітаратуры друкаванай на расейскай мове, тыпу „арлекін", „парнуха", „дэтэктыў". Савецкі чалавек знаёміцца толькі са сметнікам замежнай культуры. Пашыраецца такім чынам круг інтэлектуальнага люмпенства. Адсутнасць якой-небудзь культурнай палітыкі, накіраванай на ратаванне нацыянальнай спадчыны, відаць не толькі ў кнігарнях. Назвы вуліц, помнікі катам беларускага народа ў цэнтры горада, сталінскі рэнесанс у архітэктуры, шэрасць колераў, чужамоўныя надпісы на будынках дзяржаўных устаноў ствараюць уражанне, як бы ў сталіцы Беларусі затрымаўся час.

У праграме нашага візіту была сустрэча са студэнтамі і настаўнікамі Педагагічнага інстытута. Відаць было, што руска-

моўныя дацэнты не надта ведалі, што з намі зрабіць. Завялі, аднак, у агромністую залу запоўненую студэнтамі. Ініцыятыву ад самага пачатку ўзяў Сакрат Яновіч. У кароткім дакладзе прадставіў ён тэму: „Беларусы Беласточчыны", выказаў свае меркаванні наконт літаратуры і культуры. Неспадзявана некалькі студэнтаў пачалі нават ставіць пытанні і да таго ўсе гаварылі, у адрозненне ад сваіх прафесараў, на беларускай мове. Магчыма таму, што Сакрат у сваім выступленні не пакінуў ніякага сумнення, што ў Еўропе лічацца толькі з тымі народамі, якія маюць сваю годнасць і культуру.

Урачыстая вечарына, прысвечаная Дню беларускага пісьменства і друку, якая адбылася ў Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, прыцягнула ўвагу мінскай інтэлігенцыі. Былі прысутныя прадстаўнікі ўрада Беларусі і мітрапаліт Філарэт.

Словы прывітання, зачытаныя нейкім хлапчуком з канцылярыі прэзідэнта Лукашэнкі, не выклікалі энтузіязму публікі. Як гаварылася падчас перапынку, была гэта крывадушнасць пасля выступлення прэзідэнта перад студэнтамі менскага Педагагічнага інстытута, калі сказаў ён, што пераклады навуковай літаратуры на беларускую мову будуць стрыманыя. А тут жа быў Дзень беларускага пісьменства і друку. Таму найбольш цёпла публіка ўспрыняла выступленне паэта Ніла Гілевіча, які сказаў шчыра пару слоў у адрас дзяржаўных і царкоўных улад наконт іх адносін да роднай мовы і культуры. Атмасфера пасля выступлення Ніла Гілевіча была такая, што нават мітрапаліт Філарэт, здаецца, упершыню загаварыў па-беларуску. На сцэне тэатра імя Янкі Купалы сваю заклапочанасць пра беларускую мову і культуру выказалі, між іншым, прэм'ер-міністр Міхаіл Чыгір, міністр культуры Анатоль Бутэвіч і шмат іншых чыноўнікаў. „Мова — трава", як кажуць палякі.

Урачысты канцэрт у выкананні артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, дзяржаўных камерных хораў, харэаграфічных ансамбляў усвядоміў мне патэнцыял бсларускай культуры. Нават песні і танцы, якія адклікаліся да народных матываў, у выкананні маладых артыстаў набывалі характар высакаякаснага мастацтва. Гэта трэба бы-

ло пабачыць, гэтага словамі не прадставіць журналіст.

Сустрэча з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Сянько мімаходам прывяла ў галаву пытанне, як гэты еўрапеец і прафесіянальны дыпламат адчувае сябе ў лукашэнкаўскай камандзе. Зразумела, ні пытання, ні адказу такога не было. Міністр расказаў пра складаную сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь, праінфармаваў, што ўрад вельмі рашуча імкнецца да зменаў. Прадстаўленую намі сітуацыю на польска-беларускай мяжы міністр акрэсліў як скандальную, якая патрабуе змены ўсёй сістэмы працы мытных і пагранічных службаў.

Пагаварыўшы ў Мінску з людзьмі розных прафесій і з розных грамадскіх асяроддзяў, я дайшоў да вываду, што калі б сёння адбываліся ў Беларусі выбары, Лукашэнка атрымаў бы пад 10% галасоў. За тры дні я не спаткаў ніводнага чалавека, які б прызнаўся, што галасаваў на сённяшняга прэзідэнта. Выглядае так, што на наступных выбарах галоўным канкурэнтам Пазьняка і Беларускага Народнага Фронту будзе толькі знеахвочанасць грамадства да палітыкі і палітыкаў. Узамен за рэзкае павышэнне цэн народ не атрымаў многа — ні пачуцця справядлівасці, ні слядоў змагання з мафіяй і карупцыяй наменклатуры, ні свабоды, ні надзеі на самакіраванне. Дзяржаўная маёмасць гэтым часам як раскрадалася, так раскрадаецца, адсутнасць гаспадара відаць у кожнай краме, гатэлі, будынку, школе. А прэзідэнт на ўсё гэта прадставіў просты рэцэпт у інтэрв'ю для маскоўскага тэлебачання — „соединение с Россией". Аб'яднаў супраць сябе такім чынам цэлы нацыянальны лагер.

Дарога ў Полацак

З Мінска ў Полацак пад 250 кіламетраў. Салідная, шырокая шаша пралягае так, што мінае амаль усе мястэчкі, якія знаходзяцца на гэтым шляху. Толькі рэйсавыя аўтобусы з'язджаюць з галоўнай дарогі (1-2 кіламетры), каб забраць пасажыраў з мястэчак ды пасёлкаў. Наша група забралася ў Полацак з паломнікамі, якія везлі лампаду, запаленую агнём са Святой Магілы Гасподняй. З гэтай лампадай беларускія праваслаўныя дзеячы наведалі ўсе святыя месцы ў краіне і паставілі яе побач мошчаў св. Ефрасініі Полацкай.

Краявіды на паўночны-ўсход за Мінскам моцна напамінаюць ландшафт Беласточчыны. Трава, кусты, дрэвы амаль такія самыя, толькі вёскі выглядаюць інакш. Платоў і пуняў амаль не відаць, хаця прыватныя гаспадаркі сталі ўжо нармальнай з'явай у жыцці вёскі. Можа яшчэ гэта не такія гаспадаркі, як у Польшчы, тым не менш выразна відаць, як калгасныя монакультуры дзеляцца на 1-3-гектарныя кавалкі. На панадворках у сялян стаяць стагі з сенам, а 2-3 кароўкі на ланцугах даказваюць аб вяртанні капіталізму на вёску. Бліжэй Полацка штораз часцей паказваюцца азёры і завілістыя лініі рэчак. Вада ў азёрах такая чыстая, што здалёк відаць жоўты пясок ля берагоў. Кругом, аднак, ніводнага курорта, ні гатэля, ні рэстарана, ніякай турыстычнай інфраструктуры, якая магла б мясцовым жыхарам даваць працу і прыбытак большы, чым зарплата на полацкай прамысловасці. Так, грошы проста ляжаць на зямлі і ніхто не хоча схіліцца, каб падняць іх. Гэтае самае можна суаднесці і да горада Полацка.

Першая сталіца Беларусі

Тут, — як сказаў археолаг з Мінска, Сяргей Тарасаў, — немагчыма рыдлёўкай крануць зямлю ў агародзе, каб не трапіць на след XI ці XII стагоддзя. Славутыя помнікі архітэктуры прыкрыла аднак пацiна часу, бурлівай гісторыі, і найгоршае — чалавечага нігілізму да нацыянальнай спадчыны.

Сафійскі сабор, трэці такога тыпу пасля Канстанцінопаля і Кіева, захаваўся толькі ў малюнках і ў кшталце зробленага цяпер макета. Святыня, перабудаваная ў XVII стагоддзі ў стылі паўночна-ўсходняга барока, у нічым не напамінае першабытнай архітэктуры. Асталася царква св. Ефрасінні Полацкай (Спасаўская), але толькі 2 гады таму назад пачалі вяртаць ёй гістарычны выгляд. Пабудаваны побач яе ў канцы XIX стагоддзя сабор Богаяўлення Гасподняга пару гадоў таму назад служыў яшчэ для гадоўлі свіней. Цяпер, праўда, сцены пабелены звонку і ўнутры, але апрача іканастаса нічога яшчэ там няма. Трэба доўгага часу, каб на сценах з'явіліся фрэскі ды іконы. Свята-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр адрадзіўся таксама нядаўна. Цяпер там звыш 30-ці манашак,

у якіх надзея, што вернуць Полацкай зямлі патрачаныя духоўныя вартасці.

Драўляная і каменная архітэктура горада аднолькава патрабуюць гаспадара. Гэты старажытны горад з'яўляецца матэрыяльным доказам злачынства камунізму і яго маральнага банкруцтва. Сецэсійныя камяніцы перамешаныя тут са сталінска-брэжнеўскай архітэктурай, так што хаваюцца яны сярод вульгарнага манументалізму і балаганных форм тыповых для будаўніцтва „развітага сацыялізму". Старога горада проста няма.

Антычнасць мясцовасці ў кожнай краіне была б выкарыстана як турыстычны атракцыён. Туды б запрашалі гасцей з усёй краіны і з замежжа. Стваралі б умовы лягчэй выдаваць грошы ў гэтым горадзе. А што тут маем? У звыш статысячным горадзе толькі адзін гатэль, якога адміністрацыя працуе як у найлепшыя гады Савецкага Саюза. Калі ўжо чалавек атрымае „візу" ў адпаведны нумар, узнікае праблема знайсці этажную, якая дасць ключ. Аднак цераз гадзіну знайшлі мы маладую жанчыну, якая дзесьці цяжка „працавала" на славу „родины". Шок прыходзіць, калі ўжо ўрэшце ўдасца адкрыць дзверы нумара. Хаця была адпаведная электраўстаноўка, не было лямпак, у туалеце поўным ціскам лілася гарачая вада, да паржавелага душа страх было дакрануцца, каб той не разваліўся, а падлога ўжо з месяц не бачыла мокрай анучы. Шчасце, што Сакрат Яновіч адзначаў свой дзень нараджэння. Пакуль прадыскутавалі мы ўсе экзістэнцыялізмы, фаталізмы, камунізмы, імперыялізмы, літарасізмы і іншыя *-ізмы*, была ўжо трэцяя раніцы і нават стог саломы здаўся б тады гатэлем першай катэгорыі.

Увечары на панадворку пры ўваходзе ў царкву св. Ефрасінні быў адслужаны малебен у гонар беларускіх першадрукароў. Прысутныя мітрапаліт Менскі і Слуцкі, патрыяршы экзарх усяе Беларусі Філарэт і міністр культуры і друку Анатоль Бутэвіч сказалі з гэтай нагоды кароткія прамовы, прыпамінаючы ўклад слаўных палачан у развіццё еўрапейскай культуры. На цэнтральнае святкаванне з удзелам мітрапаліта сабралася каля 100 чалавек з Полацка, у тым пару дзесяткаў мясцовых чыноўнікаў. Народ справай не цікавіўся,

а можа нават і не ведаў, што ў іх горадзе адбываецца нейкае святкаванне, бо інфармацыі амаль нідзе я не бачыў.

Манастырская кухня

Пасля малебна мінскіх гасцей і паломнікаў епіскап Полацкі і Глыбоцкі Глеб запрасіў на манастырскую вячэру. Гадзіну пасля хацелася сказаць, што кожны разважны чалавек павінен так харчавацца, як манахі і манашкі. На стале былі простыя стравы з капусты, морквы, яблык, кашы, кампот з груш і вельмі смачныя несалодкія булкі. Вячэру з'елі мы амаль у маўчанні, не спяшаючыся, у нейкай містычнай атмасферы. Незабыўнае ўражанне.

Свята ў горадзе

4 верасня ў цэнтры Полацка на плошчы Францішка Скарыны адбыліся цэнтральныя святкаванні Дня беларускага пісьменства і друку. З Мінска прыехала 5 аўтобусаў спецыялістаў па спевах і танцах. Прыехаў таксама доўгі картэж легкавых машын з найвышэйшымі дзяржаўнымі чыноўнікамі, паэтамі ды аўтарытэтамі ў галіне навукі. Каля помніка Скарыну гербы гарадоў — цэнтраў асветніцтва і дуку ў Беларусі — Брэста, Нясвіжа, Турава, Оршы, Полацка, Мсціслава. Вакол аграмаднай плошчы стаялі прылаўкі з кніжкамі, цукеркамі, вельмі салодкім пячэннем і вырабамі народнага мастацтва. Людзей не было зашмат, магчыма таму, што святочныя гульні арганізаваліся таксама ў парку, на стадыёне і каля Музея беларускага кнігадрукавання. Даўгаватыя прамовы, падчас якіх па чарзе выступілі прэм'ер-міністр Міхаіл Чыгір, пісьменнік Іван Чыгрынаў, намеснік міністра культуры Генадзь Бураўкін, пісьменнік і публіцыст Барыс Сачанка, епіскап Полацкі і Глыбоцкі Глеб і гісторык Вольга Краско на тэму беларускага пісьменства, друку ды і наогул адраджэння беларускай культуры, занудзілі рускамоўную публіку. Мала хто слухаў даклады. Людзі хадзілі, размаўлялі паміж сабой, адчувалі сябе, як на фэстыне. У мяне склалася ўражанне, што большасць публікі нават і не ведала, з якой нагоды такі рух у іх горадзе. Кругом было весела, іграла музыка, артысты выконвалі народныя танцы. Святкавалі затым.

Хаця была гэта нядзеля, усе прадуктовыя крамы былі ад-

крыты. Масла, сыр, хлеб, каўбаса, жыгулёўскае піва, гарэлка, віно мясцовай прадукцыі былі ў неабмежаванай колькасці. Цэны толькі трошкі меншыя, чым у Польшчы. Але калі хочаш, напрыклад, купіць сыр і не маеш з сабой паперы, атрымаеш кавалак сыру проста ў рукі. Большая драма ўзнікае, калі спатрэбіцца табе масла. Упакоўкі на харчовыя прадукты, асабліва ў правінцыяльных гарадах, амаль зусім няма. Найгоршае тое, што людзі прывыклі да такой эстэтыкі і нікога гэта не абурае. Ненармальнасць стала нармальнасцю. І спатрэбіцца яшчэ шмат гадоў, адкрытых межаў, новага заканадаўства, каб змяніць гэтую рэчаіснасць.

Дні беларускага пісьменства і друку так у сапраўднасці святкавалі людзі, якія штодзень займаюцца гэтай праблемай — журналісты, пісьменнікі і адказныя за гэтую дзялянку грамадскага жыцця чыноўнікі. А можа і так быць павінна?

„Ніва" н-р 39 (2002) ад 25 верасня 1994 г.

З БЕЛАСТОКА Ў БЕРАСЦЕ, З БЕРАСЦЯ Ў БЕЛАСТОК

3-4 красавіка 1995 г. у Берасці адбывалася міжнародная канферэнцыя па праблемах школьніцтва для нацыянальных меншасцей у Еўропе. На канферэнцыю былі запрошаны таксама сябры Беларускага гістарычнага таварыства з Польшчы, якія займаліся гэтымі пытаннямі.

З Беластока ў Берасце можна даехаць непасрэдна на аўтобусе фірмы „Бякомекс" або цягнікам. Ведаючы традыцыі працы мытных і пагранічных службаў, Лена Глагоўская, Славамір Іванюк і ніжэйпадпісаны вырашылі ехаць у Беларусь цягнікам. Чыгуначны транспарт мае такую перавагу, што большменш рэгулярна пастаўляе пасажыраў у назначанае месца.

Амаль пусты цягнік рушыў з Беластока ў напрамку Бельска, Чаромхі. Быў ён аднак нейкі дзіўны. У вагонах, у якіх былі толькі лаўкі, чамусьці ўсе шрубы былі адкручаны, трэс-

ліся разбэштаныя бляхі, вокны не закрываліся, а на падлозе красаваліся высахлыя плямы ўсялякіх колераў. Можна, аднак, зарызыкаваць і сказаць, што да Чаромхі даехалі мы вагонам трэцяга класа, які найчасцей выкарыстоўваецца ў чыгуначным транспарце на тэрыторыі ўсходняй Беласточчыны. У Чаромсе, не кранаючыся з месца, мы раптам апынуліся ў вагоне тыпу „бізнесклас". Пусты дагэтуль вагон запоўніўся бізнесменамі, спецыялістамі па міждзяржаўным гандлю. Большасць з іх прыехала ў Чаромху з Сямятыч, Гайнаўкі, Кляшчэляў, Бельска і іншых мястэчак. Усе з усімі віталіся як вельмі добрыя сябры. З размоў вынікала, што папярэдняга дня ўсе яны ехалі гэтым самым цягнікам. Успаміналі пагранічнікаў і мытнікаў з абодвух бакоў польска-беларускай мяжы, называючы іх пайменна, задумоўваліся хто сёння будзе мець службу. У гэтым цягніку ўсе пасажыры звярталіся да сябе на „ты", у такой самой форме вяліся размовы з некаторымі польскімі і беларускімі пагранічнікамі і мытнікамі. „Што ты бля... дурня строіш, Янак!" — гучала ў адрас паляка; „Е... шклянку, Мікалай, то адразу лягчэй будзе пячаткі ставіць", — заахвочвалі афіцэра пагранічных войск Беларусі турысткі з Польшчы. Шэсць дзяўчатак ва ўзросце недзе ад 30-ці да 50-ці гадоў, апранутых на варшаўскі манер, не трацілі часу. Ужо ў Чаромсе пачалі снеданне, якое працягвалася недзе да трох гадзін, аж да першага прыпынку на Беларусі ў мястэчку Высокае. Пах вэнджанай каўбасы, свежых агуркоў, спірту і папяроснага дыму стварaў амаль вясельную атмасферу.

Сяброўскія размовы з кожнай мінутай станаваліся больш спантанныя. „Што ты бля... наліла ў шклянку, гэта мае 70 градусаў"— „А чаго ж сабе шкадаваць, абы-што можаш піць са сваім дырэктарам", — гучэлі размовы на суседняй лаўцы. Побачы дзве дзяўчынкі з багата размаляванымі вачыма і шчарбаты джэнтльмен голасна задумоўваліся ў каго купіць тавар — у Тані ці ў Чэся? Пасля другой бутэлькі дайшлі да вываду, што ў Чэся спірт таннейшы на 10 цэнтаў, але не мае ён такога выбару сігарэт як Таня і на дадатак жыве на акраіне мястэчка. — Далёка і цяжка несці будзе пакупкі, — заўважыла дзяўчына, зацягнуўшыся глыбока дымам „Голдэна".

— Праз дзве з паловай гадзіны цягнік будзе вяртацца з Берасця. У Тані будзе можна яшчэ нешта выпіць і з'есці, — падтрымаў сяброўку шчарбаты.

У вагоне „для некурачых" слаўся густы дым, а гутаркі станаваліся штораз больш гучнейшыя і вясёлыя. Адчувалася братэрства ўсіх людзей і народаў.

Найбольш падазронай польскім і савецкім спецслужбам здалася наша тройка з газетамі ў руках, якая ехала на канферэнцыю. Мытнікі захацелі толькі ў аднаго Славаміра Іванюка праверыць змесціва ягонай сумкі. Наш калега адрозніваўся ад іншых пасажыраў яшчэ і тым, што меў на сабе белую кашулю і гальштук. З астатнімі пасажырамі людзі ва ўніформах толькі ветліва прывіталіся.

У Высокім цягнік апусцеў амаль зусім. На падлозе валяліся толькі рэшткі харчовых прадуктаў, разлітых напіткаў і сотні акуркаў. На некаторых бізнесменаў з Польшчы чакалі іх калегі з Высокага. Каля вакзала ў мястэчку высіцца жалезны плот, за якім чакаў дзядзька з каляскай поўнай дзіўных пакункаў. Шмат асоб, купіўшы 2-3 таямнічыя пачкі, вярталіся ў цягнік, у якім вырашылі, відаць, правесці свабодны пасляабедні нядзельны час. У кожнай кардоннай пачцы было 6 бутляў спірту, з якімі можна было ўжо вяртацца дамоў.

Два дні пасля, наслухаўшыся дакладаў і выказванняў дзядзькоў з усіх куткоў Еўропы, а нават Азіі і Амерыкі, вярталіся мы той самай дарогай з Берасця ў Беласток. Мытня ў Берасці — гэта найлепшая школа ўсходнееўрапейскага бізнесу, але паколькі едучы ў Беласток мінаецца гэты незвычайны гаспадарчы цэнтр, не варта пра яго больш расказваць. Якое ж было аднак нашае здзіўленне, калі ў цягніку пабачылі мы знаёмыя твары. Цяжка было толькі здагадацца, чаму ў кожным вагоне, у якім знаходзілася 6-8 чалавек, інфармавалі нас, што ўсе месцы заняты. Але неяк удалося знайсці вагон, у якім ехала толькі старэйшая дама, якая заявіла, што мае толькі 4 літры, бо на Вялікдзень з'едуцца ўнукі і трэба іх пачаставаць нечым. Апрача яе даселіся яшчэ дзве спадарыні з сярпаста-малаткастымі пашпартамі. Цераз наш салон кожную мінуту прабягалі нейкія людзі. Некаторыя недзе спяшаліся

з адвёрткай і шчыпцамі ў руках. — Ты сядай з Гжэськам у наступны вагон, а мы пойдзем далей. — Пад спадніцу магу схаваць толькі 4 блокі. — Бутэлькі схаваем у рукавах, — чулася з суседніх вагонаў. Брынканне шкла і трэск ліпучага скоча, нервовая бегатня сведчылі, што ў цягніку павісла нейкая пагроза — Той сукін сын зноў нюхае. — У п... схавай сабе бутэльку, калі баішся.— Вазьмі ў мяне пачак „Голдэна", у цябе іх толькі пяць, — вяліся звычайныя рабочыя размовы паміж прадпрымальнымі людзьмі. Цягнік набліжаўся да Высокага. У туалет у нашым вагоне ўвайшоў чалавек у сівой уніформе і з адвёрткай у руках. Штосьці там бразгатаў і неўзабаве на калідор палілася вада. Выразна задаволены вылез ён з туалета, пабег недзе і праз хвіліну вярнуўся ў кампаніі мытнікаў і пагранічнікаў з мяшкамі. Невядома адкуль выцягнулі яны каля 150 літраў спірту. Запоўнілі імі мяшкі. Канфіскаваўшы тавар, мытнікі дайшлі пэўна да вываду, што хопіць яго, каб даказаць сваім начальнікам аб сваёй сумленнай працы. Нікога больш не правяралі. Атмасфера ў вагонах пачынала быць больш спакойная. Дзве гадзіны, пакуль цягнік стаяў у Высокім, у яго нутры вялося нармальнае сяброўскае жыццё сучасных бізнесменаў. Найкарацей кажучы, быў гэта бар чацвёртай катэгорыі з эпохі позняга Герка.

У Чаромсе невядома чаму зноў найбольш падазроным чалавекам у вагоне здаўся польскім службам Славамір Іванюк. Мытніца глядзела на яго сумку затуманенымі вачыма і пытала колькі вязе з сабой спіртных напіткаў і сігарэтаў. Загадала яна нават адкрыць сумку. Пабачыўшы кніжкі, з нейкім спачуваннем паглядзела на нас. Відаць было, што ахвотна паслала б нас у псіхічны шпіталь. Побач джэнтльмены ахрыплым голасам мармыталі, што ў іх мала часу, хацелася б яшчэ паспаць, каб паспець на заўтрашні цягнік Беласток — Берасце.

PS. Літр спірту з беластоцкага „Polmosu" ў Беларусі прадаецца на вакзале па 2,6 долара. На базары ў Беластоку каштуе ён 8,5 долара.

„Ніва" н-р 17 (2032) ад 23 красавіка 1995 г.

КАПІТАЛІСТЫЧНАЯ БЕЛАРУСЬ

Ад 1 лістапада афіцыйны Мінск рыхтаваўся да вялікага святкавання гадавіны Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі. З гэтай нагоды залуналі чырвоныя сцягі на ўсіх установах сталіцы Беларусі, на ўсіх электрычных стаўбах. У кожным месцы, дзе толькі былі магчымасці ўпрыгожання шэрых муроў, з'явіліся сімвалы ваюючага пралетарыяту. Але сёлета гэта была толькі дэманстрацыя сілы лагера ўлады. Для большасці мінчукоў, з якімі мне прыйшлося гаварыць, гэтае свята не выклікала ніякіх эмацыянальных пачуццяў. Толькі ветэранам — вайны, сацыялістычнай працы — напамінае яно час іх маладосці, нейкай рамантыкі. Сённяшні час ім зусім чужы і незразумелы. Тады шчыра перажываюць яны ўсялякія заклікі маладых цынічных палітыкаў, каб вярнуць савецкую рэчаіснасць на беларускую зямлю. Праўдападобна такая самая колькасць, але па іншых прычынах, называе гэты дзень „сатанінскім святам". Але для значнай большасці гэта яшчэ адзін свабодны ад працы дзень, а ў гэтым годзе нават два дні. Лукашэнкаўская ўлада не шкадуе людзям святкаваць. Пасля трохдзённага святкавання „Дзядоў", быў усяго адзін працоўны дзень і зноў тры дні адпачынку — нядзеля, панядзелак і аўторак. На гэты раз адпачынак у гонар памяці дасягненняў Вялікага Ільіча і яго калегаў. Дарэчы, прадпрыемствы і так працуюць толькі 2-4 дні ў тыдзень, таму кожная нагода, каб афіцыйна пасвяткаваць выгадная для ўсіх. Ёсць яшчэ на свеце шчаслівыя народы.

Крамы для багатых

Памыляецца кожны, хто піша, што Беларусь з'яўляецца скансэнам сацыялізму ў Еўропе. БССР ужо не існуе не толькі як юрыдычная адзінка вялікай імперыі, але таксама няма яе як грамадска-эканамічнай фармацыі. „Сацыялістычная рэспубліка" адышла ў гісторыю, асталіся ад яе толькі мільёны сірот, гвалтаваных кожны дзень наплываючым з усходу і з захаду капіталізмам. Капіталізм, хаця агідны большасці грамадства, даволі паспяхова аплятае знерухомелыя гіганты са-

цыялістычнай гаспадаркі. Ніякім рыцарам камунізму, хаця б і былі яны ўсемагутнымі прэзідэнтамі, не пад сілу абараніць грамадства перад захопніцкім капіталізмам. Дастаткова выйсці на любую вуліцу Мінска. Сотні людзей нечым там гандлююць — хто сабакамі, хто сланечнікам, хто бананамі, хто кніжкамі, але ўсе гэтыя людзі пакінулі ўжо спадзяванне, што дзяржава гарантаваць ім будзе хаця б мінімальныя ўмовы сацыяльнага бытавання. Побач астаноўкі метро „Кастрычніцкая" знаходзіцца звычайная прадуктовая крама. Усе харчовыя прадукты з беларускіх калгасаў, і з беларускай сыравіны, і перапрацаваныя ў мясцовых прадпрыемствах можна купляць у неабмежаванай колькасці. Цэны амаль аднолькавыя, як у Польшчы. Толькі гарэлка яшчэ напалову таннейшая, затое віно ў два разы даражэйшае. Варта, аднак, падняцца на другі паверх, дзе знаходзіцца італьянская крама, а побач яе прыватная беларуская, з мясцовымі ў большасці прадуктамі, але ў якой шмат таксама вырабаў з Польшчы.

У італьянскай краме парадак працы такі як на захадзе. Плаціць можна любой валютай пры ўмове, што яе маеш у вялікай колькасці. Выбар харчовых прадуктаў праўдападобна там не меншы, чым у Рыме, Парыжы ці Гамбургу. Цэны, праўда, ў два разы вышэйшыя, чым на першым паверсе, але пакупнікоў таксама нямала. Мінскія сябры інфармуюць мяне, што гэтыя крамы для ўсялякіх мафіёзі і дзяржаўных карумпаваных чыноўнікаў. Мне аднак здаецца, што не так дрэнна жывецца савецкаму чалавеку, як ён гэта нам прадстаўляе. Побач, у прыватнай краме з польскімі і беларускімі таварамі, цэны тых самых прадуктаў на 20-30% ніжэйшыя, але і ахвотных купляць таксама было нямала. Апрача мінеральнай вады і хлеба ўсё там нашмат даражэйшае, чым у Беластоку, аднак чэргі пры электронных касах сведчылі пра тое, што ў сталіцы Беларусі такія цэны нікога не палохаюць.

Бедныя беларусы

Паслухаўшы мінскіх знаёмых — журналістаў, лекараў, рабочых, апазіцыйных палітыкаў — у мяне склалася ўражанне, што яны зарабляюць у тры-чатыры разы менш, чым выда-

юць. Гэты эканамічны феномен Польшча перажыла двойчы: спачатку пры панаванні першага сакратара Герка, а пасля падчас ваеннага становішча. Афіцыйная сярэдняя зарплата складае 40-50 долараў. Але ўсе згодна заяўляюць, што калі б абмежаваццца толькі да афіцыйнага заробку, людзі хадзілі б абарванымі і паміралі б ад голаду. У Мінску аднак людзі апрануты больш шыкарна, чым у Варшаве, а закругленыя твары не сведчаць аб недахопе харчовых прадуктаў. Таму амаль у кожнага грамадзяніна сацыялістычная плата складае толькі нейкі працэнт таго, што ён у сапраўднасці зарабляе. Гэтая бэсэсэраўская сірата жыве перш за ўсё дзякуючы сваёй прыватнай заангажаванасці, легальна ці нелегальна, але існуе як фактар на капіталістычным рынку, а нават яго будуе супраць свае волі, не ведаючы прытым, што прымае ўдзел у гэтым працэсе. Да таго ж мае амаль дармовыя ўсе камунальныя паслугі.

Здаецца, ніколі не было ў Польшчы столькі пунктаў абмену валюты, што ёсць іх цяпер у Мінску. Долар, нямецкая марка маюць дакладна такую самую цану, што на пачатку года.

Развіццё прыватнай уласнасці найлепей відаць на прыкладзе будаўніцтва. Вакол Мінска вырастаюць катэджы быццам бы вясковыя пасёлкі, але ўласнікі новабудаваных вілаў не ездзяць на трактарах у поле, а найчасцей на „мерседэсах" ва ўсялякія „офісы" сталіцы.

Людзі ўжо перасталі думаць пра „родину", а перш за ўсё думаюць пра сябе, сваю сям'ю, свае інтарэсы. Гэта сведчыла б аб пэўнай нармальнасці, калі б усё гэтае адбывалася ў нармальнай дзяржаве. Але большасць грамадзян не ведае, ці хоча жыць у незалежнай краіне, мову суседняй дзяржавы прымае за сваю, а нацыянальныя сімвалы трактуе абыякава.

Анекдоты і палітыка

Безумоўна, галоўным героем анекдотаў, якія апошнім часам расказваюць сабе жыхары Беларусі, з'яўляецца прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Чапаеў і Брэжнеў праўдападобна ў магіле перакручваюцца ад зайздрасці. Жахлівы змест жартаў пра Лукашэнку сведчыць аб тым, што інтэлігенцкі Мінск проста не пераносіць прэзідэнта. Нікому не было і не ёсць таямніцай, што Лукашэнка не пераносіць таксама інтэ-

лігенцыі. Будучы ў Мінску, дамовіўся я на інтэрв'ю з дэпутатам ВС, былым намеснікам старшыні Беларускага Народнага Фронту, цяпер старшынёй Навукова-аналітычнага цэнтра „Беларуская перспектыва" Валянцінам Голубевым. Размова мела месца ў сядзібе Вярхоўнага Савета на плошчы Незалежнасці. Набліжалася пара абеду і дэпутат Голубеў запрапанаваў пакарыстацца ўрадавым рэстаранам. Дабрацца ў рэстаран аказалася справай не надта простай. Па прычыне прысутнасці прэзідэнта ў будынку ўсе ліфты былі выключаны. Каля дваццаці хвілін ішлі мы тады ўсялякімі калідорамі ў рэстаран, які ў сапраўднасці напамінаў мне сталовую трэцяй катэгорыі. На месцы аказалася, што большасць пустых столікаў звычайна „браніраваныя", бо неўзабаве мелі з'явіцца новаабраныя народныя дэпутаты. Сапраўды, „нардэпы" ўвайшлі ў незвычайнай цішыні. Амаль ніхто нічога не гаварыў, моўчкі чакалі афіцыянтку, якая ў даны момант магла запрапанаваць ім толькі адзін набор падаграваных страў. Дэпутаты з'явіліся ў рэстаране непасрэдна пасля сустрэчы з прэзідэнтам. Відаць, былі пад „большим впечатлением" і не зважалі на тое, што елі.

Нармальны абед, — сказаў дэпутат Голубеў, — у Мінску можна таксама з'есці — у прыватным — капіталістычным рэстаране за капіталістычную цану. Сацыялістычным дэпутатам, у большасці старшыням калгасаў, прыйшлося тады пакаштаваць сацыялістычных страў у сацыялістычным рэстаране. Відаць было як страшэнна мучыліся спадары дырэктары, падымаючы за кожным разам лыжку чагосьці, што напамінала вараную бульбу. Праўдападобна вымушаны яны былі ў гэты дзень даць зарабіць капіталістам, ідучы ў прыватныя рэстараны.

„Ніва" н-р 47 (2062) ад 19 лістапада 1995 г.

БЕЛАРУСЫ ВЫКАЗАЛІСЯ ЗА ДЭМАКРАТЫЮ

10 снежня 1995 г. вырашыўся лёс беларускай дэмакратыі. Пасля некалькіх спробаў выбару новага, упершыню дэмакратычнага парламента, удалося ў канцы назбіраць адпаведную колькасць дэпутатаў і такім чынам стварыць орган заканадаўчай улады ў рэспубліцы.

Дэмакратыя ў Беларусі нараджаецца ў цяжкіх болях. Тут, як відаць гэта цяпер, саветызацыя пранікла ў глыбіню душы кожнага чалавека. Сумленнем савецкага беларуса не скалыхнулі нават весткі пра Курапаты, мільёны памардаваных для здзяйснення шалёнай ідэалогіі. Псіхічнае зняволенне было так вялікае, што людзі не заўважылі нават кашмару афганскай вайны, дзе маладыя хлопцы гінулі, змагаючыся за імперскія мары Брэжнева і яму падобных старэчаў. У Расіі тым часам дзесяткі тысяч пратэстуючых дысідэнтаў запоўнілі турмы і псіхіятрычныя шпіталі. Большасці беларусаў запамяталася з таго часу, што хлеб, каўбаса, гарэлка, камунальныя паслугі, транспат былі вельмі танныя, а штодзённае жыццё — незвычайна простае. Улада пра ўсё думала, дакладна таксама ўсё акрэсліла: што можна, а чаго нельга рабіць. Усё і ўсім было зразумелае.

У 1990 г. сотні тысяч людзей на вуліцах Вільні, Масквы, Кіева дамагаліся свабоды і дэмакратыі. У Мінску было ціха і спакойна. Апазіцыя Беларускага Народнага Фронту ўспрымалася грамадствам як статак дзівакоў, авантурыстаў. Так, дарэчы, прадстаўлялі іх ва ўрадавых сродках масавай інфармацыі. Нават Вярхоўны Савет, які тады выбралі, не нашмат розніўся ад савецкіх рэспубліканскіх парламентаў, якія былі толькі вонкавым упрыгожаннем камуністычнай дыктатуры. Неўзабаве гэты Вярхоўны Савет стаў сапраўдным заканадаўчым органам фармальна суверэннай Беларусі. Незалежнасць прыйшла нечакана, можна сказаць выпадкова, дзякуючы са-

мадзеючаму развалу савецкай імперыі. Беларусы атрымалі яе дарма, без змагання і ахвяраў. Можа таму большасць не шанавала гэтага падарунка гісторыі. З ліку некалькіх кандыдатаў першым прэзідэнтам выбралі чалавека, які найбольш рашуча заяўляў, што верне савецкі парадак і ліквідуе незалежнасць дзяржавы, якою меў кіраваць.

Прэзідент слова стрымаў. Сапраўды зрабіў усё, каб так яно і сталася. Найгоршае прытым было вяртанне да нядобрых еўрапейскіх традыцый міжваеннага перыяду, калі дэмакратычна абраны орган улады, зараз пасля выбару, пачынаў знішчаць тую ж дэмакратыю, якая дала яму ўладу. Самазнішчальныя працэсы, якія пусціў у ход прэзідэнт, не здзейсніліся пакуль што толькі таму, што ніводная суседняя краіна, а асабліва Расія, нават маральна не падтрымалі беларускую ўладу. Наадварот, расійскія сродкі масавай інфармацыі, а асабліва прыватныя, паказвалі тое, што дзеялася ў Беларусі як нешта трагікамічнае, гратэскнае, неверагоднае і небяспечнае. Там дзяржаўная манаполія ў тэлебачанні, радыё, прэсе была ліквідавана.

Прага ўлады ў прэзідэнта была так вялікая, што задумаў ён кіраваць дзяржавай без ніякага парламента. Пайшоў далей чым савецкія дыктатары, якія прынамсі фармальна захоўвалі існаванне заканадаўчых органаў улады. Беларускае тэлебачанне і радыё рабілі ўсё, каб адвесці грамадзян ад удзелу ў выбарах. Калі б прыйшло галасаваць менш чым 50 працэнтаў выбаршчыкаў, Лукашэнка кіраваў бы дзяржавай пры адсутнасці якога-небудзь іншага органа ўлады. Сам ствараў бы законы і сам пільнаваў бы іх рэалізацыю. Не было б нават каму распісаць чарговых прэзідэнцкіх выбараў. Дзеля такога вырашэння спраў прэзідэнт закрыў нават на некалькі дзён расійскае тэлебачанне на тэрыторыі Беларусі, па якім Шушкевіч, Грыб і іншыя лідэры апазіцыі заклікалі грамадзян да актыўнага ўдзелу ў выбарах. Дзеячы БНФ гаварылі словы, якіх не спадзяваліся пэўна сказаць ніколі: „Галасуйце на каго хочаце, нават на камуністаў, але толькі прыйдзіце і аддайце свой голас".

На працягу чатырох гадоў існавання свае дзяржавы штось

аднак адмянілася ў грамадскім выхаванні беларусаў. Рашучая большасць, ідучы галасаваць 29 лістапада і 10 снежня, свядома выказалася за дэмакратыю і супраць таталітарнага кіравання. Людзей не стрымала ні нахабная антывыбарчая прапаганда, ні найлепшыя фільмы ў тэлебачанні, ні неспрыяльнае надвор'е. Няважна нават, што новы Вярхоўны Савет больш левы чым папярэдні, але выбраны ён паводле дэмакратычных правілаў і мае маральнае і канстытуцыйнае права на вяршэнне дзяржаўнага заканадаўства.

Гэтыя выбары паказалі таксама, што савецкая маса памалу, але пастаянна, пераўтвараецца ў супольнасць грамадзян свядомых таго, што ад іх саміх залежыць іх уласны лёс. Калі толькі пратрывае дзяржава, праўдападобна ў будучыні не трэба будзе беларусам саромецца за вынікі свайго галасавання. Пачаткі заўсёды бываюць нялёгкія.

„Ніва" н-р 53 (2068) ад 31 снежня 1995 г.

МІНСКАЯ ПАНАРАМА

Жадаюць прыемнага падарожжа

У палове студзеня польска-беларускую мяжу перасякалася так сама як граніцы ў Заходняй Еўропе. Пуставата было ў цягніку і магчыма таму пагранічныя службы з пашанай ставіліся да пасажыраў, дзякуючы якім маюць яны працу. Упершыню бачыў я беларускага таможніка ў выглядзе прыгожай жанчыны, якая размаўляла на беларускай мове, не цікавілася ні зместам кніжак, якія я меў пры сабе, ні колькасцю долараў, і якая, паставіўшы пячатку на дэкларацыі, нават пажадала мне прыемнага падарожжа.

Горад прыгожых жанчын і таннай гарэлкі

У апошніх гадах Мінск, дзякуючы прэзідэнту Лукашэнку, стаў адным з найбольш вядомых гарадоў Еўропы. Беларусь цяпер амаль пастаянна прысутнічае ва ўсіх сродках масавай інфармацыі. Тое што, аднак, найбольш кідаецца ў вочы пасля прыбыцця ў Мінск, гэта незвычайная колькасць прыгожых дзяўчат, прытым нядрэнна апранутых. Гэтыя кветкі, на

жаль, хутка адцвітаюць, пераўтвараючыся ў „советских женщин” з усімі прыкметамі гэтага стану.

Імкненне да вонкавай элегантнасці большасці насельніцтва сталіцы Беларусі настолькі відавочнае, што робіць яно ўражанне грамадства багацеяў. Здаецца, аднак, што ў пануючых грамадскіх і псіхалагічных умовах элегантнасць — гэта форма выяўлення свайго „я”. Чалавек, які не мае шанцаў мець свой дом, кватэру, аўтамабіль, на працу ездзіць на тралейбусе ці на метро, усе ашчаднасці накіроўвае на куплю вопраткі. У іерархізаванай сістэме вонкавы выгляд указвае на грамадскую пазіцыю, прэстыж асобы. Асаблівым прыкладам савецкай эстэтыкі з’яўляюцца гіганцкія калоны будынкаў у цэнтры горада. Гэта архітэктура з іншага кутка свету, іншай традыцыі, ідэалогіі. Серп, молат і чырвоная зорка не маюць жа ніякіх сувязяў з антычнай карынфскай арнаментоўкай. Знішчыўшы арыгінальную беларускую архітэктуру, саветы за вялікія сродкі ўпрыгожылі горад усялякімі дзівацтвамі, будынкамі неакрэсленых стыляў, помнікамі катам мясцовага насельніцтва. Дзесяткамі гадоў стваралі яны грамадства, якое цяпер не адчувае патрэбы мець нічога свайго — уласнай думкі, этыкі, гісторыі, традыцыі, мовы. Людзі пакорліва успрымаюць тое, што запрапануе ім улада.

Афіцыйна грамадзянін Беларусі зарабляе 50-70 долараў у месяц. Пенсіянеры атрымліваюць 20-40 дол. Цэны, аднак, вышэйшыя тут чым у Польшчы на 20-30 працэнтаў. Сала, напрыклад, даражэйшае ў 5 разоў, бульба — у 6, хлеб і малако каштуюць прыблізна столькі сама. Выключэннем з’яўляецца цана мясцовых гарэлак. Найтаннейшая каштуе адзін долар, за два можна купіць сапраўды высакаякасную „Пшанічную”. Замежныя алкагольныя напіткі нашмат даражэйшыя чым у Польшчы. Балгарскае віно каштуе, напрыклад, 7-8 долараў, столькі ж — кілаграм каўбасы. Ніхто, аднак, не мог мне растлумачыць як можна перажыць за 50 долараў у месяц, а прытым прыгожа апрануцца. Праўда, жыхары Беларусі, пакуль што, маюць амаль дармовае карыстанне кватэрамі, сімвалічную аплату за тэлефон і ўсе камунальныя паслугі.

Даволі цяжка таксама зразумець іншыя элементы белару-

скай эканомікі. У прыватных рэстаранах, дзе цэны вышэйшыя ў 3-4 разы чым у беластоцкіх і дзе амаль цалкам пуста, афіцыянты робяць уражанне, што госці ім зусім непатрэбныя. У кафэ-барах, што ў цэнтры горада, за чай у пластмасавым кубачку жадаюць столькі ж, што ў рэстаране варшаўскага „Марыёта". Мінскія калегі тлумачылі мне, што ў цэнтры сталіцы ўсе гастранамічныя паслугі падзелены паміж прэзідэнцкія і мафійныя фірмы, няма там сапраўднай прыватнай канкурэнцыі. Таму не варта шукаць ніякай лагічнай сувязі паміж цэнамі і характарам паслугаў.

Краіна вахцёраў

Оруэлаўскі Вялікі Брат (*Год 1984*) быў прысутны ў доме, ложку, душы кожнага чалавека. Беларускі Вялікі Брат таксама спадарожнічае грамадзянам краіны ў кожным месцы, дзе яны знаходзяцца. Пра Вялікага Брата гавораць выключна шэптам. Прытым кожны перакананы, што і так яго нехта падслухоўвае. Паралізуючы страх, пачуццё бяссільнасці і сапраўдная беднасць зламалі хрыбет інтэлігенцыі. Паважаныя прафесары, літаратары, мастакі, дзеячы вярнуліся ў рэчышча, якім плылі яны раней дзесяткамі гадоў. Выключэннем у гэтым плане з'яўляюцца такія маральныя аўтарытэты як Васіль Быкаў ці Ніл Гілевіч. Памяркоўную апазіцыйнасць праяўляюць таксама дзеячы ўсялякіх грамадскіх арганізацый, якія сябруюць з замежнымі фондамі. Яны проста вымушаны часам заяўляць пра сваю заклапочанасць лёсам беларускай дэмакратыі.

Прыгнятальная большасць грамадзян Беларусі звыклася з прысутнасцю, амаль у кожным месцы, усялякіх вартавых — ва уніформах і без уніформаў. Немагчыма ўвайсці ў бібліятэку не атрымаўшы некалькіх пропускаў. Раней трэба запоўніць некалькі бланкаў з усялякімі данымі пра сябе, паказаць адпаведныя дакументы, якія пацвярджаюць праўдзівасць уласнаручна напісанага. Пасля можам увайсці ў залу для чытачоў і атрымаць жаданую кніжку ці, напрыклад, мінулагоднюю падшыўку „Советской Белоруссии". На другі дзень, зараз пры ўваходзе, трэба нанава даказваць „женщине", што маем дакументы, якія дазваляюць чытаць кніжкі. У Доме друку, дзе знаходзяцца рэдакцыі большасці дзяржаўных га-

зет, нават калі ідзеш па запрашэнні знаёмага журналіста міліцыянт пакуль выпіша пропуск, дакладна правярае пашпарт. Другі, які стаіць чатыры метры далей, яшчэ раз правярае пашпарт і, толькі што выпісаны, пропуск, пытае, што знаходзіцца ў маёй сумцы.

Сотні тысяч людзей у Беларусі займаюцца ўсялякім кантролем, выпісваннем дазволаў на праход праз калідор, сходы. Гэта звычайна прыхаванае беспрацоўе. Маладыя, здаравенныя мужыкі, якія некалькі гадзін стаяць у адным месцы, звярэюць, шукаюць усялякіх спосабаў, каб паказаць сваю ўладу і неабходнасць стаяць на вызначаным ім месцы. Дарэчы, кожны на іх месцы рэагаваў бы падобна. Выклікае гэта нейкі кашмар, які ўсе тут ўспрымаюць як нармальнасць.

Толькі мастацтва вечнае

Нягледзячы на ўсю шызафрэнічнасць пануючага ў Беларусі савецкага парадку, жыццё ў Мінску плыве як у нармальным сталічным горадзе. Большасць жыхароў займаецца сваімі бытавымі праблемамі. Так як у кожным кутку свету людзі думаюць пра сям'ю, каханне, сяброў, ворагаў, грошы, адпачынак і г.д. Пра палітыку гавораць яны няшмат, а прытым лічаць яе нечым брудным, немаральным.

16 студзеня на Траецкім прадмесці, у галерэі „Жильбел" адкрывалі выстаўку твораў 11 мінскіх мастакоў. Усе выстаўленыя творы аб'ядноўвала адна тэма — прывабнасць жаночага цела. Дзве гадзіны да адкрыцця выстаўкі арганізатары наладзілі прэс-канферэнцыю. Рэдакцыі прыслалі выключна жанчын, якія перш за ўсё хацелі даведацца пра асабістыя кантакты мастакоў з натуршчыцамі. Асабліва цікавіла іх ці падчас творчага працэсу паміж тымі двума аб'ектамі выступалі нейкія эмацыянальныя сувязі. На вызначаны час адкрыцця выстаўкі з'явілася каля 300 чалавек, не ўсе нават змаглі памесціцца ў экспазіцыйнай зале. У той жа дзень у Оперным тэатры ставіўся балет „Страсці Рагнеды". Хаця білеты каштавалі ажно 100 тысяч рублёў (2,5 дол.), не было ніводнага свабоднага месца. На наступны дзень таксама шматлікую публіку прыцягнула опера Вердзі „Травіята". Каб увайсці ў Тэатр імя Янкі Купалы, трэба было прасіць мінскіх ка-

лег дапамагчы набыць білет. У Эксперыментальным, дзе калектыў паказваў анатомію дыктатуры паводле „Макбета” Шэкспіра, быццам бы не было месца нават для стаяння.

Мінчане як бы ўцяклі ў свет ілюзіі. Магчыма, што яны ў мастацтве шукаюць адказаў на пытанні, якія ў апошніх гадах паставіла ім жыццё. Цяпер у Беларусі лічыцца кожны жэст, падтэкст, анекдот. Дарэчы, прэзідэнт Беларусі стаў галоўным героем усялякіх жартаў. Значна апярэдзіў ён у гэтай галіне генсека Брэжнева.

БНФ рыхтуе пераварот

Па прэзідэнцкім тэлебачанні заявілі, што Пазьняковы нацыяналісты рыхтуюць дзяржаўны пераварот. Нейкі камсамолец, па прозвішчы Аляксандр Зімоўскі, быццам бы адталы экспанат бальшавіка 1938 года, дэталёва тлумачыў хто з дзеячаў Фронту і колькі мільёнаў долараў атрымаў на змаганне з усенароднаабраным прэзідэнтам. Вінцук Вячорка, які — паводле Зімоўскага — разбагацеў з бюджэту ЦРУ на 3,8 млн. сказаў, што задаволіўся б хаця б адным працэнтам ад гэтай сумы.

Сойм БНФ, які засядаў 17 студзеня, займаўся перш за ўсё ўнутранымі канфліктамі. Адсутнасць Пазьняка выклікае штораз больш выразнае змаганне за ўладу ў арганізацыі. Уся гэтая тусоўка выглядала як рулетка на „Тытаніку”. Фронтаўцы прынамсі, як адзіная арганізацыя ў Беларусі, усе прынцыпова размаўляюць на беларускай мове.

Дзень раней у сядзібе Свабодных прафсаюзаў Беларусі, што па вуліцы Энгельса, сабраліся лідэры апазіцыйных партый, каб абмеркаваць формы супрацоўніцтва з Беларускім бюро, якое нядаўна было адкрыта ў Бруселі. Сход вёў былы віцэміністр замежных спраў Андрэй Саннікаў. Антылукашэнкаўскія апазіцыянеры ў знакамітай большасці размаўлялі на расійскай, лукашэнкаўскай мове. Дзве гадзіны змагаліся яны з ветракамі, а пасля разышліся.

Безумоўна, вялікім дасягненнем Лукашэнкі з’яўляецца маргіналізацыя апазіцыі, якая ў сапраўднасці зведзена цяпер да дэкаратыўнай ролі. І толькі паталогія савецкага менталітэту пхае рэжым да змагання з ценямі, прывідамі, прыдуманымі

загаворшчыкамі. Беларуская апазіцыя не адсуне прэзідэнта ад улады. Могуць яго яе пазбавіць маскоўскія таварышы, калі так ім будзе выгадна. Другую пагрозу для рэжыму нясе яго абсурдная падаткавая палітыка. Ненасытнасць Ціцянкова, галоўнага адміністратара маёмасці Лукашэнкі, замарожвае гаспадарку. Падаткамі і фінансавымі кантролямі прыкончана ўжо большасць малых прыватных фірмаў. Зразумела, што рэжыму патрэбны грошы на ўтрыманне арміі ўсялякіх вахцёраў і кантралёраў, але фіскалізм, здаецца, дасягнуў апошніх межаў. Беларус наогул усё перанясе і нават у жалюгодным становішчы будзе паўтараць: „Каб толькі горш не было". Але шмат маладых людзей пачынае ўжо ўсведамляць, што ў іх толькі адно жыццё.

Ад 15 да 21 студзеня цана долара павышалася штодзённа на 500 беларускіх рублёў. 21 студзеня ў абменных пунктах Белбанка плацілі 41 500 рублёў за адзін долар, а прадавалі па 42 500. За польскую златоўку банкі плацілі 12 000 рублёў. Інфляцыя тут вялікая, нават ва ўмовах беларускай эканомікі.

Бог разумее беларускую мову

Пры саборы св.св. Пятра і Паўла дзейнічае Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў, якім кіруе Мікола Матрунчык. 15 студзеня братчыкі наладзілі дыскусійны панэль з удзелам выдатных прадстаўнікоў мінскай інтэлігенцыі і святароў. Сабралася каля 70 чалавек. Дыскусія вялася на тэму перспектываў увядзення беларускай мовы ў царкоўнае жыццё. Усе прысутныя гаварылі на беларускай мове. Прытым адкрытасць дыскусіі была проста імпазантная. Некалькі разоў прыпаміналася прызабытая праўда, што Царква — гэта не мітрапаліты, архіепіскапы і святары, што Царква — гэта проста супольнасць вернікаў. Прафесары Уладзімір Конан і Анатоль Клышка гаварылі пра памылковыя меркаванні царкоўнай іерархіі наконт беларускай мовы, вядомыя інтэлектуалы Леанід Дзягілеў і Аляксей Дудараў ставілі пытанне: Ці можа святар асвячаць танкі і ядзерныя ракеты ды што гэта мае супольнага з хрысціянствам? З прычыны русіфікаванасці большасці вернікаў прысутныя пагаджаліся, што беларускую мо-

ву ў царкоўны ўжытак трэба ўводзіць вельмі памяркоўна. Святары паўтаралі свой стары тэзіс, што няма адпаведных перакладаў літургічных тэкстаў і таму немагчыма поўнасцю служыць літургію на беларускай мове, а прытым, аргументавалі, старажытнаславянская мова — таксама свая.

19 студзеня ў чарзе за свянцонай вадой каля сабора Св. Тройцы стаяла пару тысяч людзей. За парадкам сачылі два міліцыянеры. Таксама пры ўваходзе ў царкву, пры кожных дзвярах стаялі міліцыянеры, але цяпер толькі дзеля парадку, хаця па прывычцы ўнутры храма не здымалі шапак, упрыгожаных як і раней сярпом і молатам.

„Ніва" н-р 6-7 (2178-2179) ад 8-15 лютага 1998 г.

ЛЕТА НА БЕЛАРУСІ

Па палітычных прычынах пра Беларусь пішацца найчасцей дрэнна, а нават вельмі дрэнна. Тым часам апрача Лукашэнкі і яго каманды ў Беларусі яшчэ звыш 10 мільёнаў людзей, з якіх знакамітая большасць жыве такімі ж праблемамі як і грамадзяне іншых краін свету. Для тае большасці найважнейшае пытанне — як прыдбаць грошай і расходаваць іх згодна са сваімі прыватнымі патрабаваннямі. Для адных такім асноўным патрабаваннем — пакупка кілаграма каўбасы, другім — паездка на адпачынак у Балгарыю, яшчэ іншым — замен старога „форда" на новае „аўдзі".

На ўсходняй мяжы без перамен

Паездка з Польшчы ў Беларусь штораз больш складаная. Апрача фармальных складанасцей, пра якія часта пісала прэса, з'яўляюцца ўсё новыя нечаканасці, якія могуць сустрэць наведвальнікаў Беларусі. Рэзка абмежавалася колькасць аўтобусаў, якія адпраўляюцца з Беластока ва ўсялякія гарады рэспублікі. У сярэдзіне ліпеня, падчас турыстычнага сезона, без ніякага паведамлення быў абмежаваны да аднаго ў тыдзень курс цягніка Беласток — Масква, якім раней выгадна можна было трапіць у сталіцу Беларусі. Цяпер чыгуначным

транспартам найхутчэй можна даехаць у Мінск цераз Варшаву.

Едучы з Беларусі найлепш трапіць у польскі вагон, таму што не раскручваюць іх на мяжы нейкія дзіўныя асобені, якія быццам бы прадстаўляюць польскія мытныя службы. У Тарэспалі, у беларускім вагоне, якім мне прыйшлося вяртацца з Мінска адкруцілі кожную шрубу, заглянулі ў кожную шчыліну, а адзін чэкіст у нейкім дзіўным камбінезоне абнюхваў усе куткі не горш за сабаку. Узровень хамства па абодвух баках мяжы вельмі падобны і безумоўна з'яўляецца ён адлюстраваннем палітычных адносін паміж Польшчай і Беларуссю. На беларускай мяжы патрабуюць цяпер ад іншаземцаў запоўніць дзве аднолькавыя дэкларацыі. Тамашнія чэкісты ўсё яшчэ абараняюць Савецкі Саюз і нават не заўважылі, што ад некалькіх гадоў яго ўжо няма.

Ізаляцыя

У Мінску 24 ліпеня шмат асоб збіралася ў Вільню на канферэнцыю прысвечаную беларусам, што пражываюць у Прыбалтыцы. Якое ж было здзіўленне дзеячаў беларускіх арганізацый, калі ў літоўскім пасольстве сказалі ім за візу заплаціць 40 долараў. Гэта палова сярэдняй зарплаты ў Беларусі, больш чым адна зарплата настаўніка. Раней цана візы была нашмат ніжэйшая, але і так рух на мяжы з гэтай краінай быў невялікі. Цяпер праезд у краіны Прыбалтыкі грамадзянам Беларусі гэта такая ж складанасць як у Заходнюю Еўропу. Ізаляцыя, ці, як некаторыя пішуць, самаізаляцыя Беларусі сталася фактам.

Жыццё як бы плыве нармальна

Калі б не кантактавацца з жыхарамі Беларусі звонку, усё выглядала б прыблізна так, як прадстаўляе гэта прэзідэнцкая прапаганда. У цэнтры Менска адрамантаваныя тратуары, вуліцы і дамы. У дзяржаўных крамах можна купіць усе асноўныя гатункі харчовых прадуктаў. Толькі па-ранейшаму смурод, які стаіць унутры савецкіх крамаў проста адпіхае пры самым уваходзе, а тавар „дзевушка" падае без ніякай упакоўкі. Калі, напрыклад, пакупнік мае ахвоту купіць сыр і забыўся ўзяць з сабою адпаведную паперу ці сумку, най-

лепш тады пабегчы да найбліжэйшага кіёску, набыць „Советскую Белоруссию” (найтаннейшая) і такім чынам кліент не будзе вымушаны трымаць прадукт непасрэдна ў далоні.

У прыватных крамах тавараў як бы больш, з’явіліся таксама фіскальныя электронныя касы і маладыя прадаўшчыцы, не памянялася толькі культура абслугоўвання. „Дзевушкі”, якіх за прылаўкам тры разы больш чым трэба, так занятыя сабою, што рэдка калі звяртаюць увагу на пакупнікоў. У нармальнай сістэме, дзе пра ўзровень жыцця кожнага чалавека вырашаюць правілы рынку, такая сітуацыя была б немагчымай. Але ў Беларусі не можа быць беспрацоўя, таму ніхто не вымушаны клапаціцца пра якаснасць свае працы. У крузе гэтай палітыкі знаходзіцца таксама г.зв. прыватны бізнес, дзе захоўваюцца адпаведныя нормы занятку.

Армію патэнцыяльных беспрацоўных відаць усюды. Яна, пакуль што, на фіктыўных штатах, але гэта рак, які знішчыць кожную структуру. У архівах, бібліятэках і рэдакцыях сядзіць натоўп людзей, якія толькі правяраюць пячаткі і подпісы на ўсялякіх пропусках, якія выпісалі іхнія калегі, што сядзяць побач. Адзін каля аднаго сядзяць кантралёры ва уніформах і без уніформаў. Немагчыма ад іх нічога даведацца, а адзіны адказ, які можна ад іх пачуць: „Идите вот туда, и там вам всё скажут”.

Жыгулёўскае агульнадаступнае

Пасля пару тыдняў дажджу 24 ліпеня на Беларусь прыйшла сапраўдная спякота. У Мінску ў цяні было 37 градусаў. Людзі хадзілі з бутэлькамі напояў у руках. Аднак штурм жыхароў сталіцы на мінеральную ваду і піва беларуская гаспадарка вытрымала лепей чым у мінулым годзе польская. Вада была агульнадаступнай ва ўсіх пунктах продажу. Сокі замежнай і краёвай вытворчасці стаяць непарушна таму, што даражэйшыя ад гарэлкі. Піва таксама можна купіць на кожным кроку. Праўда, няма вялікага выбару, але агульнасавецкае „Жыгулёўскае” стаіць у кожным кіёску і кожнай краме. На праспекце Скарыны, цэнтральнай вуліцы Мінска, шмат півярняў пад адкрытым небам. За адзін долар без ніякай чаргі можна купіць 4 куфлі найлепшага лідскага піва. Больш

аматараў мае аднак таннейшае „Жыгулёўскае”, але вытрымаць яго можа не кожны страўнік.

Рэстараны для „дзелавых ліц”

Тыя, што маюць грошы, не патрабуюць візаў, каб гуляць на такім узроўні, які гарантуецца ў Італіі, Францыі ці іншых краінах г.зв. Захаду. У Мінску шмат рэстаранаў, дзе можна з'есці абед у цане 100 долараў на асобу, выпіць піва, якога цана за паўлітровую бутэльку адпавядае вартасці тыдня працы настаўніка і памыць рукі ў туалеце не горшым чым у варшаўскім „Марыёце”. Шмат такіх рэстаранаў, трохі прыхаваных, каля вуліцы Нямігі і праспекта Машэрава. Найчасцей таксама ўсе месцы ў іх занятыя. Афіцыянткі, якія па сваёй натуры з'яўляюцца цудам прыроды, вельмі ветлівыя і аператыўныя. Унутры залаў казачны свет расліннасці і рамесніцкага прафесіяналізму. Стараўся я даведацца, хто наведвае гэтыя рэстараны. Адзін з мясцовых журналістаў пачаў мне пералічваць гасцей: „Тых чатырох з маладымі дзяўчатамі — людзі з адміністрацыі прэзідэнта, той — дырэктар дзяржаўнай фірмы, а там — салдаты мафіі..., дзелавыя ліца, як у нас іх называюць у тэлебачанні”.

Чысты горад

Ідучы па вуліцах сталіцы Беларусі няма нічога, што нагадвала б той вобраз, які прадстаўляецца ў польскіх сродках масавай інфармацыі. Вуліцы падмецены, трава ў парках ды іншых месцах скошана, сотавыя тэлефоны ў руках маладых людзей і безліч жанчын незвычайнай прыгажосці. З другога аднак боку відаць, што трошку далей ад цэнтра тратуары нерамантаваныя ад савецкіх часоў, лаўка ў парках вялікая рэдкасць, а каля сметнікаў раз-пораз нехта правярае іх змесціва. Пажылыя людзі хапаюць кожную паперку, якую можна прадаць у пунктах прыёму адпадкаў.

Летам, а асабліва ў пятніцу пасля абеду, гарады ў Беларусі пусцеюць. Аж цяжка паверыць, што растрыбушаныя аўтобусы прыгарадскога транспарту могуць памесціць столькі людзей. Аўтобусы, з якіх толькі адзінкі даўно павінны стаяць у музеі, усе штодзённа праязджаюць парусот кіламетраў. Па прычынах колькасці пасажыраў узнікае там толькі праблема

як зачыніць дзверы, але, нягледзячы на іх лічбу, савецкая тэхніка спраўляецца дасканала. Аўтобусы амаль заўсёды зварухнуцца з месца, а пасажыры не заўважаюць нічога асаблівага ў такім стане транспарту. Так было заўсёды, значыць — усё нармальна.

Спакойна плыве жыццё на Беларусі, людзі рыхтуюць на зіму запасы салёных агуркоў, вараць маліны, ягады. Самагонку не аплачваецца рабіць самому. Гарэлка ў крамах такая танная, што перакрэслівае сэнс хатняй прадукцыі алкаголю.

„Ніва" н-р 32 (2204) ад 9 жніўня 1998 г.

БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ І САВЕЦКАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ

У днях 17-18 красавіка 1999 г. Каардынацыйны камітэт „Гродзенская ініцыятыва" ладзіў канферэнцыю, прысвечаную беларускай нацыянальнай ідэі. Згаданую арганізацыю ўзначальвае былы гродзенскі ваявода Сямён Домаш, а сярод арганізатараў канферэнцыі заўважыў я таксама былога мэра горада Алеся Мілінкевіча, прафесара Алеся Астроўскага і Фелікса Гавіна. Гэты апошні ў прыватнасці з'яўляецца сынам выдатнага дзеяча польскай меншасці ў Беларусі Тадэвуша Гавіна.

Канферэнцыя на вакзале

Канферэнцыя пра беларускую нацыянальную ідэю, па зразумелых прычынах, не магла атрымаць блаславлення ўлад. Таму арганізатары не маглі знайсці адпаведнай залы для васьмідзесяці яе ўдзельнікаў. Усё адбывалася амаль у канспіратыўных умовах. Вучоныя, грамадскія і палітычныя дзеячы, якія з'ехаліся з амаль усяе Беларусі, сабраліся ў памяшканні Аб'яднання „Ратуша". Пасля ўсе адправіліся на чыгуначны вакзал, дзе ў рэстаране і адбылася канферэнцыя. Пакуль што Лукашэнка не выдаў указ, які забараняў бы ўваход у рэстараны сваім апанентам.

Арганізатары запрасілі да дыскусіі на тэму нацыянальнай

ідэі спецыялістаў розных галін навукі — філосафаў, біёлагаў, фізікаў, гісторыкаў, прадстаўнікоў політэхнічных навук. Гэта ва ўмовах сучаснай Беларусі мае глыбокі сэнс. Інтэлігенцыя, так як калісь у Польшчы перыяду ваеннага становішча, мае спрыяльныя ўмовы для роздумаў. Апрача мышлення не надта можна цяпер у Беларусі нешта рабіць. Калі нехта не праяўляе вынікаў сваіх роздумаў вонкаваму свету, можа нават жыць цалкам спакойна, ніхто яго не чапае. Памылкай арганізатараў канферэнцыі лічу прысвечанне большасці часу загадзя падрыхтаваным рэфератам. Некаторыя выступленні проста прасіліся палемікі ці паяснення. Калі пра гісторыю гавораць біёлагі ці фізікі, часта ў іх выступленнях больш ідэалагічнага падыходу чым фактаграфіі. З другога боку, аднак, калі людзі розных дысцыплін навукі шукаюць апраўдання сваіх думак аб сучаснасці ў гісторыі, можна гэта ўспрымаць толькі станоўча. Праблема грамадзян Беларусі заключаецца толькі ў тым, што пераважную большасць грамадства вучылі не гісторыі, але нейкай прыдуманай бальшавікамі міфалогіі пра мінулае.

Пра панславізм і берасцейскую унію

Адкрываючы канферэнцыю Сямён Домаш заявіў, што Беларусь стала ахвярай шавіністычнага напору чужой нацыянальнай ідэалогіі пад лозунгамі панславізму. Беларусы пераўтвараюцца сёння ў меншасць у сваёй краіне. Уладзімір Конан, філосаф з Мінска, заўважыў, што імперыялісты культурны характар падпарадкаваных зямель мяняюць не толькі метадам этнічнага генацыду, але робяць гэта таксама мірным шляхам. Такі працэс праходзіць цяпер у Беларусі. Згодна з логікай імперыі нацыянальная беларуская мова пераўтвараецца ў рэгіянальны дыялект. Для гэтага дастаткова паставіць на адпаведным месцы нейкага Сашку са Шклова і даць яму адпаведныя ўказанні. Шмат гаварылася і пра тое, як у Польшчы ліквідаваліся ўсе прывіды камунізму. На жаль, не было нагоды растлумачыць, што гэта яшчэ адзін міф, які гэтым разам стварыла антырэжымная прапаганда ў Беларусі.

Часта падчас выступленняў вярталася праблема берасцейскай уніі. Большасць вучоных і палітычных дзеячаў Беларусі лічыць, што была яна вынікам унутраных патрэб беларускага

грамадства Вялікага княства Літоўскага, што была праявай імкнення захаваць нацыянальную самастойнасць беларусаў. Эмацыянальна-ідэалагічны падыход элітаў Беларусі да падзеі звыш трохсотгадовай даўнасці нічым не меншы чым сярод беластоцкіх царкоўных дзеячаў. Рацыянальнага абмеркавання гэтай тэмы, здаецца, яшчэ доўга трэба будзе чакаць.

У чаканні тэрмінатара

Пару слоў праўды пра нацыянальны характар беларусаў выказаў дзеяч Беларускага Народнага Фронту Лявон Баршчэўскі. Беларусы, паводле ягоных даследванняў, не з'яўляюцца ні талерантнай, ні ветлівай, ні працавітай нацыяй. Большасць грамадзян падчас вольных і дэмактартычных прэзідэнцкіх выбараў у 1994 г. аддала свае галасы за тых кандыдатаў, якія ўвасаблялілі тып тэрмінатара. Такіх кандыдатаў было двух — Пазьняк і Лукашэнка — і атрымалі яны звыш 70 працэнтаў галасоў у першым туры выбараў. Абяцалі, што калі атрымаюць уладу, тады навядуць парадак — пасадзяць, пакараюць і г.д. Кандыдаты, якія прапанавалі больш дэмакратычны сцэнарый развіцця падзеяў, адыгралі маргінальную ролю.

Шмат выступаючых шукала адказу на пытанне, што такое *этнас*, меншае зацікаўленне было паняццем *народ*. Пару вучоных, напрыклад Аляксей Саламонаў з Мінска, гаварылі нават, што этнас гэта *боскае стварэнне*. Былі і іншыя надта смелыя тэзісы, напрыклад: Янка Купала як ідэолаг дэмакратызму, талерантнасці і плюралізму. У такім шырокім кругу людзей, прэзентуючых розныя плыні навуковай і грамадскай дзейнасці, маглі, зразумела, з'яўляцца ўсялякія высновы іх інтэлектуальнай творчасці.

Беларускі блюз Шалкевіча

На фоне надта тэарэтычных у сваёй большасці выступленняў вучоных і дзеячаў вельмі каларытным паказаўся канцэрт Віктара Шалкевіча на заканчэнне першага дня канферэнцыі. Ягоная самаіронія, шчырасць, з якой апісвае ў сваіх песнях беларусаў, яўрэяў, палякаў і рускіх, здаецца больш уносіць у развіццё беларускай нацыянальнай ідэі чым творчасць дзесяткаў вучоных. Нават песня пра павалены Яновічаў плот у Крынках гучыць у Беларусі як гімн пра гарманічны, свой-

скі беларускі свет, які выклікае вялікі сентымент у жыхароў „лукашенлэнда".

Арышт Гавіна і смерць Карпенкі

17 красавіка беларускае тэлебачанне паінфармавала пра арышт міліцыяй старшыні Саюза палякаў Беларусі Тадэвуша Гавіна. У той час Гавін прабываў сярод удзельнікаў канферэнцыі, але раней сапраўды яго арыштавалі за ўдзел у нелегальным пікеце. Палякі выступілі да ўлад са сваімі асветнымі пастулатамі, але ўлады працягваюць ігнараваць іх патрабаванні. Спадар Гавін, — як мне сам сказаў, — заклікаў беларускіх нацыянальных дзеячаў ісці разам з палякамі са сваімі сімваламі і дамагацца таксама беларускага школьніцтва. Гэтая ж дзяржава называецца Беларусь, — пераконваў. Не пераканаў, палякі пайшлі самі, а суд над Гавіным, за парушэнне ім грамадскага парадку, вызначаны быў на 21 красавіка.

У Беларусі шмат гаворыцца пра раптоўную і загадкавую смерць Генадзя Карпенкі. Шмат хто не верыць у натуральны сыход з гэтага свету апазіцыйнага дзеяча. Справа Карпенкі спалучаецца са справай былога дырэктара Нацыянальнага банка Беларусі Таццяны Віннікавай, якая пазбаўлена волі ўжо амаль два гады. Быццам бы нейкія інфармацыі, якія ведала Віннікава, дайшлі да Карпенкі, калі той збіраўся на нейкую канферэнцыю ў Варшаву. Але пра ўсё гэтае гаворыцца шэптам. Страх родам з савецкай эпохі бесканкурэнтна царствуе ў Беларусі.

Гарадзенская мытня

Сімвалам савецкага хамства і адсутнасці нацыянальнай ідэі з'яўляецца гарадзенская мытня. Зніклі натоўпы беларусаў, рускіх, якія ездзілі гандляваць у Польшчу, прапалі палякі, якія па розных прычынах наведвалі Гародню, засталіся толькі тыя самыя савецкія, не кранутыя часам мытнікі і пагранічнікі. Малалікіх пасажыраў цягніка, які адпраўляўся ў Польшчу, правяралі дакладна, з характэрным пачуццём нейкай кадэбісцкай пагарды. Вярталі назад грамадзян Беларусі, якія везлі на беластоцкі базар прадукты „советского производства". Раней, каб купіць білет у Беласток, выдалі яны вялікую частку сваіх жабрачых пенсій. Мяне, замежніка, праверылі яшчэ больш

дакладна. Двойчы пералічылі ўсе залатоўкі і беларускія рублі, якія я меў пры сябе, а не знайшоўшы ў падарожнай сумцы ніякіх, апрача кніжак, прадуктаў „советского производства", папрасілі зняць боты і праверылі ці няма кантрабанды ў падэшвах. Усё закончылася шчасліва, бо боты вярнулі. Далей, аднак, не ведаю, чаму кожнаму іншаземцу, які прывозіць у Беларусь так пажаданую валюту і плаціць, напрыклад, за месца ў гатэлі ў 10 разоў больш чым мясцовыя, мытнікі і пагранічнікі безупынна даказваюць „что вы нам тут не нужны".

Можна сабе толькі ўявіць сітуацыю, калі б на мяжы стаялі беларусы, людзі ва уніформах з пачуццём нацыянальнага гонару, які ведалі б, што іх паводзіны з'яўляюцца першай праявай характару нацыі. Пасажыры на прывітанне пачулі б тады невядомыя сучасным памежным службам словы: „Добры дзень", на развітанне: „Жадаем добрага падарожжа". Замежнікі пачулі б: „Цешымся, што захацелі вы нас наведаць, запрашаем прыехаць у чарговы раз". Можа калі-небудзь здзейсняцца мары пра беларускую дзяржаву, якой функцыянеры на сваіх пастах будуць змагацца за захаванне нацыянальнага гонару беларусаў.

„Ніва" н-р 18 (2242) ад 2 мая 1999 г.

ПЯЦЬ ГАДОЎ ПАНАВАННЯ ЛУКАШЭНКІ

Паводле канстытуцыі, прынятай Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 14 сакавіка 1994 г., у ліпені гэтага года скончыўся тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Але, як вядома, прэзідэнт загадзя пастараўся стварыць юрыдычныя падставы, каб астацца пры ўладзе. Падчас другога рэферэндуму ў лістападзе 1996 г. змяніў ён канстытуцыю і прадоўжыў свае паўнамоцтвы да 2001 года. Згаданы рэферэндум быў карыкатурай дэмакратыі і дэмакратычнага выяўлення волі грамадства. Прэзідэнту, аднак, гэта дало падставы спасылацца на дазвол народа аднавіць таталі-

тарную сістэму кіравання.

Які баланс пяцігадовага панавання Лукашэнкі? У суседніх рэспубліках — Літве, Латвіі, Эстоніі, Украіне ўзніклі незалежныя, нацыянальныя дзяржавы, у якіх народ становіцца сапраўдным суверэнам. Тым часам ніхто ў свеце і мала хто ў Беларусі верыць у тое, што ў гэтай рэспубліцы пра нешта вырашае народ. У 1990 г. пачалася нараджацца не толькі незалежная Беларусь, але таксама грамадзянскае мысленне пра дзяржаву. Для часткі беларусаў, хаця можа яшчэ і невялікай, упершыню заіснавала нешта, што называецца нацыянальным гонарам. Для эміграцыі і беларусаў, пражываючых у суседніх краінах, з'явілася надзея, што іх адстойванне беларускасці, часта ў вельмі неспрыяльных умовах, будзе служыць Бацькаўшчыне. Пару месяцаў пасля выбару Лукашэнкі на пост прэзідэнта толькі г.зв. советские люди маглі быць задаволенымі. Прэзідэнт абяцаў вяртанне краіны ў глыбокае мінулае і — трэба прызнаць — слова стрымаў. Скончылася свабодная дыскусія наконт выбару шляхоў развіцця нацыі, на яе месцы з'явіўся асаблівы спектакль з удзелам аднаго акцёра, які паўтараўся ў тэлебачанні амаль кожны дзень. У вачах людзей нанава з'явіўся страх, а інтэлігенцыя шчырыя размовы зноў пачала весці шэптам. Нават апазіцыйных дэпутатаў служакі Лукашэнкі трапалі ў парламенце, парушаючы тым самым усе цывілізаваныя нормы палітычнага жыцця. Пры ўладзе неўзабаве апынуліся афіцэры расійскіх спецслужбаў, якія раней былі найчасцей супрацоўнікамі савецкага КДБ. Разам з Лукашэнкам ініцыявалі яны рэферэндум у справе нацыянальных сімвалаў і дзяржаўнай мовы. Дэмагогія і хлусня, выпякаючыя з манапалізаваных дзяржавай сродкаў масавай інфармацыі, зрабілі сваё. Пасля рэферэндуму нейкі лукашэнкаўскі дзікун Ціцянкоў перад камерамі прэзідэнцкага тэлебачання рваў беларускі нацыянальны сцяг. Гэта быў звычайны жэст акупацыйнай пыхлівасці.

Разам з прыходам да ўлады Лукашэнкі пачалося таксама вяртанне да саветчыны ў галіне асветы, навукі і культуры. Сёння горш, чым было пры Брэжневе. Няма ўжо ў Беларусі школ з беларускай мовай навучання. У БССР былі такія шко-

лы прынамсі па вёсках. Бацькам хлапчука з Магілёва школьныя ўлады бессаромна заявілі, што ён псіхічна хворы, таму што не валодае рускай мовай, а толькі беларускай. Ці ёсць яшчэ недзе ў свеце краіна, улады якой так пагарджаюць мовай карэннага насельніцтва? У 1998 г. паказалася ў Беларусі кніжка *Гісторыя Беларусі* ў дзвюх частках. Прыгожая, цвёрдая вокладка, ціснёныя залатыя літары на ёй. Рэдактарамі выдання з'яўляюцца прафесары Я. К. Новік і Г. С. Марцуль. Кніжка рэкамендуецца Міністэрствам адукацыі РБ у якасці дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. Можна там прачытаць, што асвечаныя бальшавікамі беларускія масы чакалі камунізму як выбаўлення. „Да кастрычніка 1917 г. выступленні пралетарыяту, сялянства Беларусі і салдат Заходняга фронту згуртаваліся ў адзіную плынь, была створана сацыялістычная армія сацыялістычнай рэвалюцыі" (ч. II, с. 17). Чытаючы далей можа скласціся ўражанне, што бальшавіцкія камісары — Карл Ландар, Аляксандр Мяснікян, Вільгельм Кнорын, якія пацыфікавалі беларускі нацыянальны рух, былі найбольшымі беларускімі нацыянальнымі героямі. Беларускай інтэлігенцыі прапануецца паважаць тых, якія знішчалі першую беларускую незалежную дзяржаву — БНР, як носьбітаў нацыянальнай свабоды, збаўцаў народа. Рэнегацтва такім чынам вырастае на дабрадзейнасць, а паводзіны акупацыйных улад становяцца ўзорам палітычнага мыслення для маладых жыхароў сённяшняй РБ. Такое выхаванне моладзі знішчае волю змагання будучых пакаленняў за свабодную Беларусь, за захаванне яе прэстыжу ў свеце.

За апошнія пяць гадоў Лукашэнка прывёў Беларусь да поўнай ізаляцыі ў Еўропе. Сёння прэзідэнцкае тэлебачанне паказвае яго паездкі ў Забайкальскі край ці Уладзівасток як вялікую міжнародную падзею. Візіт мэра Масквы ці Пецярбурга ў Мінск вырастае да рангу прыбыцця кіраўніка магутнай дзяржавы. Ад некалькіх гадоў беларусам пастаянна паказваецца, што іх краіна і яе ўлады — выключныя партнёры суб'ектаў Расійскай Федэрацыі.

Вяртанне да прынцыпаў камуністычнай дзяржавы выклікала таксама адмоўныя паслядоўнасці ў эканоміцы, якія бу-

дуць толькі паглыбляцца, але якія не павінны пагражаць трываласці панавання Лукашэнкі. Прыклад Паўночнай Карэі паказвае, што калі таталітарная ўлада кантралюе ўсе галіны жыцця, тады нават галодная смерць мільёнаў людзей не выклікае ніякіх хваляванняў. Кім Ір Сен таксама пасля пяці гадоў панавання не стаў аб'ектам рэлігійнага абагаўлення. Сёння, аднак, ніхто там не сумняваецца, што нябёсы падаравалі яго паўночным карэйцам дзеля іх збаўлення. У Беларусі яшчэ ніхто ад голаду не памірае, і не відаць там ніякіх прадпасылак узнікнення нейкага арганізаванага руху супраціву. Зменамі ў Беларусі ніхто не зацікаўлены таксама ў Расіі. Лукашэнка пакуль што з'яўляецца найлепшым гарантам маскоўскага кантролю над Беларуссю. Таму магчыма, што падчас наступнай кадэнцыі адбудзецца нейкі чарговы рэферэндум, у якім „народ выкажацца" за пажыццёвую ўладу Лукашэнкі ў Беларусі.

„Ніва" н-р 31 (2255) ад 1 жніўня 1999 г.

ВОСЕНЬ НА ПАЛЕССІ

Ёсць месцы на зямлі, якія сваім краявідам неяк асабліва ўражваюць. Такой краінай несумненна з'яўляецца беларускае Палессе. Яно мае сваю душу, якая па нейкіх прычынах не дазваляе ставіцца абыякава да тамашніх гарадоў, вёсак, прыроды, людзей. Можа таму, што там найбольш адчуваецца натуральнасць і прысутнасць астаткаў таго свету, пра які ўспаміналі нашы бацькі і дзяды.

З Брэста ў Пінск найпрасцей даехаць чыгункай. Адлегласць паміж гэтымі гарадамі параўнальна такая ж як з Беластока ў Варшаву. Праезд дарогі даўжынёю 180 кіламетраў атрымліваецца амаль дармовым. Пералічваючы на залатоўкі білет у Пінск каштуе 70 грошаў. У Польшчы яго цана была б у 60 разоў вышэйшая. Але логіку беларускай эканомікі розумам ахапіць немагчыма. Цягнік з Брэста рушыў вельмі дакладна, згодна з рэгламентам і паводле ўсіх прынцыпаў чыгуначнага

руху, існуючых у Савецкім Саюзе. У цесна запоўненых пасажырамі вагонах было невыносна душна. Шмат людзей патрачаную з арганізма ваду папаўняла жыгулёўскім півам, дарэчы, нават цалкам добрым. Найбольш дзіўнае, што ў натоўпе не адчувалася ніякай агрэсіі. У нашай краіне ў такой сітуацыі маладыя людзі так часта кідаюць матам, што складваецца ўражанне, быццам у польскай мове найважнейшыя словы пачынаюцца літарай „к".

Перад ад'ездам, па радыёвузле паведамілі пасажырам, што ў вагонах нельга курыць, піць гарэлку, выкідаць смецце, а падчас руху — адкрываць дзверы і выходзіць з цягніка. Камюніке такога зместу паўтарылі некалькі разоў падчас звыш шасцігадзіннага падарожжа. Палова пасажыраў вярталася з Тарэспаля, ці можа яшчэ далей адкульсьці з Польшчы. Тое, што зарабляюць недзе там працуючы хапае, як расказвалі, каб пражыць паўмесяца, на другую палову трэба выпрацаваць хаця б гандлюючы на польскіх базарах. Але цяжка ў гэтых людзях дашукацца было нейкага пачуцця роспачы, наадварот, наогул ганарацца яны тым, што могуць зарабляць грошы, дзякуючы сваёй прадпрымальнасці. Гэта яшчэ раз даказвае, што калі б стварыць гэтаму народу спрыяльныя ўмовы для свабоднай гаспадарчай дзейнасці, стане ён адным з багацейшых у Еўропе.

Сталіца Палесся Пінск, а асабліва частка горада над ракой Пінай, магла б стаць раем для турыстаў. Чыстая вада, шматлікія астраўкі і паўастраўкі, лагодны бераг Піны, набярэжныя паркі ствараюць знакамітыя натуральныя ўмовы для адпачынку. Недалёка ад горада Піна сустракаецца з Прыпяццю. Абедзве рэчкі настолькі глыбокія, што свабодна плаваюць па іх вялікія судны. У савецкі час з Пінска да Мазыра пастаянна плавалі судны, у Пінску была база палескай флатыліі, а яе матросаў яшчэ сёння з вялікім сентыментам успамінаюць мясцовыя дамы.

У былым езуіцкім кляштары знаходзіцца цяпер музей Піншчыны. Даволі рэпрэзентатыўна прадстаўляе ён мінулае гэтай зямлі. Ёсць там усё, што звязанае з сялянскай, шляхецкай, магнацкай матэрыяльнай і духоўнай культурай. Боль-

шасць экспанатаў звязаных з жыццём палескай вёскі амаль такая самая, як прылады, якімі раней карысталіся беларусы Беласточчыны. Шкада толькі, што ў нас ніколі не ўзнікне такі музей. Лёгка тады было б зарыентавацца ў культурнай блізкасці гэтых зямель.

Добра было б, каб стваральнікі гайнаўскага музея замест Мінска наведалі пасёлак Моталь непадалёк Пінска. Дзякуючы намаганням старшыні мясцовага калгаса і пару энтузіястаў захавання каштоўнасці мінуўшчыны Палесся ўзнік музей, якім можа ганарыцца ўся Піншчына. Апрача экспанатаў матэрыяльнай культуры супрацоўнікі музея арганізуюць наведвальнікам паказ мясцовага фальклору. Аказваецца, што можна на гэта глядзець з вялікай прыемнасцю.

Недалёка Моталя знаходзіцца мястэчка Іванава. За дзве гадзіны можна яго абысці навокал. Іванава — прыклад суіснавання трох цывілізацыйных праслоек. У цэнтры мястэчка аграмадныя будынкі мясцовай адміністрацыі, дом культуры. Такой інфраструктурай мог бы ганарыцца нават абласны горад. Вакол гэтых цэнтраў машэраўскія шэрыя шматпавярховыя блёкі. Далей ад цэнтра — з аднаго боку стары драўляны горад, дзе большасць дамоў памятае часы Леніна, а можа нават цара Мікалая, з другога — вырастае квартал для сучасных багацеяў. Вілы, можа не так шыкарныя як тыя, будаваныя вакол Беластока, сведчаць аб тым, што некаторыя ў Беларусі маюць таксама грошы. Стары квартал, у якім пражывае прыгнятаючая большасць жыхароў гарадка, нагадвае жывы скансэн. Вокны ў хатках такія маленькія, што складаецца ўражанне прабывання ў мінулым стагоддзі. Толькі тэлевізійныя антэны сведчаць пра тое, што ў дамах гэтых прысутнічае электронная тэхніка канца дваццатага стагоддзя.

З Пінска ў Гародню едзецца аўтобусам сапраўды добрымі і амаль цалкам пустымі дарогамі. Час ад часу рэйсавы аўтобус мінае нейкія старыя грузавікі, амаль цалкам не сустракаюцца легкавыя аўтамабілі. Няма бензіну. Даволі дзіўна гэта выглядае пасля невыносна перапоўненых дарог у Польшчы. У краявідзе паўночнага Палесся амаль не сустракаюцца рэчкі, ручайкі, балоты. Бальшавікі ў сваім шаленстве зма-

гання з прыродай цалкам знішчылі мясцовую гідралагічную раўнавагу. Гэтай частцы Палесся як бы вырвалі яе душу. Нейкая яна ненатуральная, сумная. Спадчынай пасля пралетарскай улады з'яўляюцца тут таксама руіны палаца Сапегаў у Ружанах. Невядома чаму, напрыклад, камуністы не захацелі яго пераўтварыць у дом народнай творчасці, адміністрацыйны цэнтр мясцовага калгаса, дом для сірот ці нешта падобнае.

Гарады Беларусі вылучаюцца не прыгажосцю архітэктуры, а тамашніх дзяўчат. Як заўважыў мой рэдакцыйны калега, „у Беластоку ці ў Варшаве за тыдзень часу не сустрэнеш столькі статных жанчын, што ў Беларусі можаш пабачыць за адну гадзіну". Гэты народ не заслужыў на тое, што пра яго гаворыцца і пішацца ў польскіх сродках масавай інфармацыі. У тэлерэпартажах Вальдэмара Мілевіча бачым найчасцей п'яных дэгенератаў ці жабракоў. У сапраўднасці нічога такога няма нават у глыбокай правінцыі. Жабракоў і п'яніц можна сустрэць у кожным горадзе ў свеце. Няпраўда, што беларусы хочуць таннай каўбасы і гарэлкі. Гэтага другога прадукту няма ўжо ў крамах пару тыдняў і неяк ніхто з-за гэтага не распачае. Хаця Беларусь пастаянна кампраметуе кіруючы краінай безыдэйны і безнацыянальны клан, але тыя людзі, якіх сустракаецца на вуліцах зусім з ім не атаясамліваюцца. Жывуць яны сваімі праблемамі і не хочуць нічога ведаць ні пра Лукашэнку, ні пра яго апанентаў. Ад улады чакаюць толькі аднаго: каб дазволіла спакойна жыць, працаваць і зарабляць грошы. Няпраўдай ёсць, як пішуць беластоцкія славянафілы, што дэмакратыя і лібералізм — гэта катастрофа для Беларусі. Беларускае грамадства больш гатовае да адабрэння лібералізму, чым польскае. Яно перш за ўсё патрабуе свабоды.

„Ніва" н-р 42 (2266) ад 17 кастрычніка 1999 г.

„РУССКИЙ ГОРОД МИНСК”

Кожная паездка ў Беларусь прымушае актуалізаваць погляд наконт таго, што адбываецца ў гэтай краіне. Найменш мяняецца ў Беларусі толькі вонкавы выгляд гарадоў, мястэчак, вёсак. Праўда, у сталіцы нават шмат будуецца і рамантуецца, але толькі на галоўных вуліцах. На фоне архітэктуры сталінскага рэнесанса і брэжнеўскага мадэрнізму асабліва вылучаюцца амерыканскія бары „McDonalds” і расійскія банкі. Апрача будынкаў, дзе памяшчаюцца ўладныя ўстановы, большасць астатніх патрабуе рамонту. Проста, сімвалічным прыкладам такога стану з’яўляецца Дзяржаўны тэатр оперы і балета. Звонку будынак тэатра больш напамінае калгасны склад хімікатаў, чым месца прэзентацыі культуры сусветнага ўзроўню. Дзяржаўная ці прэзідэнцкая ўласнасць большасці архітэктурных аб’ектаў у сталіцы вызначае ім сумны лёс, асабліва, калі бюджэт краіны не дазваляе на ўтрыманне нават іх невялікай колькасці. Прыватызацыя, аднак, немагчымая па ідэалагічных прычынах.

Мінск не з’яўляецца, аднак, такім кашмарным горадам, якім яго часам паказвае Вальдэмар Мілевіч у польскім тэлебачанні. Ідучы вуліцамі сталічнага горада не відаць ніякіх праяваў крызісу, пра што пастаянна заяўляе апазіцыя. Шырокія вуліцы і тратуары, шматлікія чыстыя паркі выклікаюць добрае ўражанне. Ёсць дзе затрымацца, адпачыць, паесці і выпіць піва. Амаль усе прадуктовыя крамы і рэстараны працуюць у суботу і нядзелю, некаторыя кругласутачна. Савецкая традыцыя гандлю і паслуг, здаецца, адышла ў забыццё. У большасці крамаў можна купіць амаль усё тое, што ў Польшчы. Беларускія харчовыя прадукты каштуюць прыблізна столькі як у Беластоку, імпартныя нашмат даражэйшыя. Найбольш тавараў з Расіі. Асабліва піва маскоўскіх і пецярбургскіх піўзаводаў стала сапраўднай канкурэнцыяй мінскім і лідскім вытворцам гэтага напою. Пакуль што беларускія піўзаводы выігрываюць цаной. Лідскае каштуе, напрыклад, 300,

а маскоўскае — 500 рублёў (долар — 950 рублёў), але часцей у руках мінскай моладзі можна пабачыць расійскае піва.

На Камароўскім базары можна набыць хіба ўсё, што вырошчваецца ў садах і агародах свету, а таксама ўсе гатункі рыбы, мяса ў выглядзе сыравіны ці перапрацаваных прадуктаў. У нядзелю гандлюе там некалькі тысяч людзей, пакупнікоў таксама шмат — прыцягвае іх трошкі ніжэйшая цана, чым у крамах.

Загадкай для мяне было толькі тое, як гэта ўсё адбываецца, калі людзі заяўляюць, што зарабляюць 20 долараў у месяц, хаця выразна відаць, што выдаюць у крамах некалькі разоў больш. Выглядае на тое, што ценявая зона ў гаспадарцы выразна здамінавала тую афіцыйную. Большасць мінскіх рэстаранаў, у якіх заўсёды поўна людзей, для грамадзяніна Польшчы звычайна задарагія, каб карыстацца іх паслугамі, але, відаць, значаную частку грамадзян Беларусі тамашнія цэны не палохаюць.

* * *

Мінск — горад не бедны, аднак, нішто ў ім не напамінае, што знаходзішся ў сталіцы незалежнай дзяржавы. Хутчэй напамінае ён цэнтр расійскай правінцыі. Праехаўшы ўсю дарогу з Гродна ў Мінск, не пашанцавала мне пачуць беларускую мову, хаця яна там, побач расійскай, дзяржаўная. У гродзенскай гасцініцы „этажная" звярнула мне ўвагу, што „ручник — это польское слово, по-белорусски — это полотенце". Пры аўтавакзальнай касе „девушка" не магла зразумець слова „аўторак". Калі мне не хацелася выяўляць свае патрабаванні на рускай мове, тады яна крыкнула: „Не могли бы сказать «вторник». А то сиди и думай, что это за «аўторак»".

Невядома чаму ў звычайных людзей, беларусаў, свая мова выклікае злость, нейкія адмоўныя рэакцыі. Калі, аднак, загаворыш да іх на рускай трасянцы, зразу пазнаюць у табе замежніка і гатовыя служыць радай і дапамогай. Каланіяльная культура зусім выціснула сваю. Пасля кароткага перыяду беларусізацыі ў пачатку дзевяностых гадоў, з прыходам да ўлады Лукашэнкі пачаўся наступ велікарускага шавінізму на Беларусь. З'явіліся тут нацыяналістычныя, нават фашыстоўскія рускія

групоўкі. Большасць членаў складалі, аднак, беларускія адурманеныя мужыкі. У кіёсках Белсаюздруку можна купіць нацыяналістычную рускую літаратуру, няма, аднак, ніякай патрыятычнай беларускай прэсы. Шматтыражная „Советская Белоруссия" прапагандуе ідэю вяртання ў Савецкі Саюз, а гэтым самым адбудовы расійскай імперыі. У кніжных магазінах літаратура на беларускай мове — рэдкасць. Пераважная большасць прац, нават па гісторыі Беларусі, напісана на рускай мове і з маскоўскага пункту гледжання. Пасля двух гадоў адсутнасці ў Мінску заўважаецца, што працэс русіфікацыі сталіцы Беларусі ідзе маланкава. Моладзь у Парку Чалюскінцаў з вялікім эмацыянальным заангажаваннем спявае пра салдат, якія змагаліся за матушку Расію.

Расказваю пра свае назіранні сябрам з Фронту (Пазьнякоўскага). „Глянь хто кіруе рэспублікай", — адказваюць. Прэм'ер-міністр Уладзімір Ярмошын і ўсе яго намеснікі: Андрэй Кабякоў, Урал Латыпаў (адначасна міністр замежных спраў), Уладзімір Замяталін, Валер Кокараў; міністр архітэктуры і яго намеснікі, міністр унутраных спраў і яго намеснікі, міністр абароны і яго намеснікі, міністр адукацыі і яго намеснікі, міністр па надзвычайных сітуацыях і яго намеснікі, міністр эканомікі і яго намеснікі, міністр юстыцыі і яго намеснікі, Цэнтральная выбарчая камісія — усе рускія. На працягу некалькіх гадоў, без аднаго салдата і выстралу з незалежнай краіны Беларусь асталася толькі яе назва, але ніхто не ведае ці такой яна астанецца.

Найгоршае тое, што мала хто ў Беларусі заўважае ненармальнасць становішча краіны. Большасці грамадзянам незалежная рэспубліка была праявай ненармальнасці. Сёння як бы ўсё вярнулася да нормы. Нахабная, а нават хамская ўлада, падвойная маральнасць, відавочны страх звычайных людзей перад міліцыянерам, чыноўнікам сталі праявамі штодзённага жыцця. Гэты стыль добра вядомы ўсім народам былога Савецкага Саюза. Толькі некаторыя народы, у адрозненні ад беларусаў, вырашылі адкінуць савецкую традыцыю і вярнуцца да сваёй.

„Ніва" н-р 24 (2300) ад 11 чэрвеня 2000 г.

БЕЛАРУСЬ У МІНІЯЦЮРЫ

У месцы зліцця рэк Пцічы і Менкі, амаль у цэнтры Мінскага ўзвышша, знаходзіцца музей-запаведнік „Менка". Пачалі яго ствараць пры канцы сямідзесятых гадоў і, нягледзячы на працу, якую да гэтай пары паглынула пабудова, усё яшчэ патрабуецца шмат часу і сродкаў, каб поўнасцю рэалізаваць праект гэтага музея. Займае ён плошчу 150 гектараў і захоўвае помнікі драўлянай архітэктуры Беларусі канца XIX і пачатку XX стагоддзяў. У хатах, цэрквах, свірнах, школах, дварах, корчмах тае эпохі знаходзяцца ўсе прадметы і прылады штодзённага карыстання тагачасных жыхароў.

Музей-запаведнік адлюстроўвае матэрыяльную культуру Беларусі ўсіх яе раёнаў — Міншчыны (Цэнтральнай Беларусі), Усходняга і Заходняга Палесся, Панямоння, Падняпроўя і Паазер'я. Плануецца, што кожны раён будзе мець у музеі ўсю драўляную архітэктуру пачатку XX стагоддзя, з захаваннем усіх яе рэгіянальных асаблівасцей. Ужо цяпер прывезеныя ў „Менку" экспанаты сведчаць аб вялікім багацці архітэктурных форм Беларусі. Мне, як жыхару Беласточчыны, шмат што з паказаных у „Менцы" помнікаў архітэктуры было знаёмае, але большасць аказалася зусім новым. У музеі знаходзіцца, напрыклад, свіран з Глускага раёна, у які, па загадзе царскіх улад, сяляне прывозілі восенню частку свайго збожжа. Кожны селянін меў у ім свой засек, падзелены на дзве часткі, што давала магчымасць ратацыйнага абмену накопленых там запасаў. Назапашанае зерне было ўласнасцю паасобных сялян і выкарыстоўвалася калі ўзнікла нейкае няшчасце — засуха, пажар і г.д. Тая эпоха не ведала жульніцкіх страхавых фірмаў тыпу ПЗУ, аднак створаныя ўладамі формы забеспячэння дазвалялі сялянам пратрываць найгоршае.

Рарытэтам у музеі з'яўляецца драўляная царква пачатку XVIII стагоддзя. Брама і акружаючы яе паркан таксама драўляныя. Царква ўзведзена была без аднаго цвіка. У сярэдзіне

храма, як і ў тагачасных хатах, прыцягваюць увагу голыя брусы сцен. Філасофія ўпрыгожання царквы тут зусім іншая, чым аздабленне храмаў у царскі перыяд, калі з'явіўся тэатралізаваны імперскі стыль. У XVIII стагоддзі такія формы былі характэрны каталіцкім касцёлам. Іканастасы царскага перыяду, ці ранейшыя барочныя алтары ў касцёлах паказвалі не евангельскія ідэі, але перш за ўсё магутнасць уласнікаў храмаў. Беларускае сакральнае вясковае будаўніцтва засяроджвалася на рэлігійных матывах, польскае і каталіцкае — на палітычнай прапагандзе. У другой палове XIX стагоддзя да ідэйнага змагання з палякамі прыступіла Расійская царква. Але чужой імперскай архітэктуры няма ў музеі.

Асаблівую цікавасць выклікалі ў мяне архітэктурныя формы сялянскіх сядзіб пачатку XX стагоддзя. Перш за ўсё ўражвае сядзіба з Докшыцкага раёна, дзе ў адным радку, паралельна, стаяць хата, хлеў і пуня. Навонкі ўсё спалучае драўляная агароджа, высокая як сцены гаспадарчых будынкаў і пабудаваная з такіх жа брусоў як пуня. Унутры знаходзяцца два панадворкі — паміж хатай і хлявом ды хлявом і пуняй. Напамінае гэта абарончы тып сядзібы, што ў XX стагоддзі было даволі абсурдным і сведчыла хутчэй аб псіхалагічных патрэбах захавання прыватнасці ўласнікаў гэтай сядзібы. Дарэчы, нават сёння вакол мадэрных катэджаў на акраінах Беластока можна сустрэць мураваную агароджу высокую на тры метры, з-за якой відаць толькі другі паверх будынка. У адным і другім выпадку нечаканаму госцю не ўвайсці без дазволу гаспадара.

На тэрыторыі музея не толькі знаходзіцца, але і працуе карчма, якая прапануе наведвальнікам настойку на зёлках, мёдзе і невядома на яшчэ якіх спецыях, якой, здаецца, не пагрэбавалі б жыхары Алімпа. Пасля другой чаркі госці маюць ахвоту заявіць пра нешта важнае, праяўляючы шчырыя сяброўскія адносіны да ўсяго свету. А пасля трэцяй нават палякі спявалі беларускія народныя песні. Дарэчы, трэба пабыць у сапраўднай карчме, каб зразумець продкаў.

„Ніва" н-р 39 (2315) ад 24 верасня 2000 г.

У ЦЯНІ ЧАРНОБЫЛЯ

Ад 15 гадоў Беларусь жыве ў цяні катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. 26 красавіка 1986 года выбух рэактара ў суседняй савецкай рэспубліцы паказаў, што вялікая сучасная тэхніка ў руках прафанаў можа быць таксама небяспечнай як ядзерная зброя ў распараджэнні шаленцаў. Амаль 70 працэнтаў радыеактыўнага пылу з Чарнобыля ўпала на Беларусь. Чвэрць тэрыторыі рэспублікі, на якой пражывала больш за 2 мільёны людзей, стала моцна атручанай.

Пятнаццаць гадоў таму беларусы перажылі найбольшае няшчасце пасля вайны. Затраты, нанесеныя рэспубліцы радыеактыўным выпраменьваннем, дасягнулі 235 мільярдаў долараў. Такіх грошай не мелі нават самыя заможныя краіны свету. Найбольш сродкаў патрабавала лячэнне хвароб, якія сталі вынікам уздзеяння ядзернага прамянявання. Людзі, якія раней самі сябе ўтрымлівалі, сталі патрабаваць дапамогі або паміраць у прадуктыўным узросце. Адсутнасць сродкаў на лячэнне пацярпелых і прафілактыку прывяло да дэмаграфічнай катастрофы на Гомельшчыне і Магілёўшчыне — там упала найбольш радыеактыўнага пылу. Медычнай дапамогі ў лячэнні хвароб, выкліканых Чарнобылем, можа патрабаваць нават 2 мільёны жыхароў Беларусі. Цярпець могуць нават тыя людзі, якія нарадзіліся пасля катастрофы, таму што некаторыя хваробы з'яўляюцца як вынік змены генетычнага коду іх бацькоў. На пачатку дзевяностых гадоў Беларусь стала краінай найкарацейшага жыцця грамадзян у Еўропе.

Другую групу коштаў складаюць матэрыяльныя рэсурсы, выключаныя з гаспадарчага жыцця Беларусі — лясы, рэкі, палі, фабрыкі, вёскі і гарады, пакінутыя ў зоне, з якой высялілі людзей.

Грамадскі кошт чарнобыльскай катастрофы быў бы меншы, калі б тадышнія савецкія ўлады прынамсі троху паклапаціліся за лёс сваіх падданых. Некалькі дзён трымалі яны ў таямніцы інфармацыю аб здарэнні ў Чарнобылі. Калі сусветныя СМІ га-

варылі пра катастрофу ўкраінскай электрастанцыі, саветы даказвалі сваім грамадзянам, што нішто ім ад пажару ў мястэчку на Украіне не пагражае. У час, калі на зямлю падаў радыеактыўны пыл, несвядомыя жыхары Беларусі працавалі ў полі, дзеці гулялі ў пясочку, людзі шпацыравалі, карыстаючыся веснавым надвор'ем. На традыцыйныя першамайскія шэсці выйшлі мільёны савецкіх грамадзян. Камуністычная прапаганда, спасылаючыся на аўтарытэты савецкай навукі, даказвала, што ўся небяспека мінула і толькі імперыялістычныя СМІ, каб акампраметаваць Савецкі Саюз, безупынна гавораць пра выбух на Чарнобыльскай АЭС. Міністр аховы здароўя Савецкай Беларусі, Віктар Бур'як, некалькі разоў тлумачыў па тэлебачанні, што можна нармальна жыць нават у раёнах мяжуючых з Украінай, дзе радыеактыўнасць у дзесяткі разоў перасягала нормы бяспекі. І толькі высокія камуністычныя чыноўнікі вывозілі сваіх жонак і дзяцей на поўнач краіны. З забруджаных раёнаў масава ўцякалі лекары, чыноўнікі і спецыялісты, якія маглі б паменшыць адмоўны ўплыў аварыі на здароўе грамадства.

Толькі 4 мая ўлады Беларусі пачалі значыць зону, прабыванне ў якой было небяспечным для здароўя. У яе абсягу апынулася 485 мясцовасцей — з іх планавалася высяліць усіх жыхароў. Прайшло 10 дзён пасля выбуху, калі пачалі высяляць першых людзей з забруджанай зоны.

Грамадства вымушана было дорага плаціць за нікчэмнасць сваіх улад. Пры канцы васьмідзесятых гадоў хутка пачала ўзрастаць колькасць захворванняў на рака крыві, касцявога мозгу, хваробы стрававальнага апарату і дыхальных шляхоў. У Магілёўскай вобласці ўсё больш людзей паміраіла і ўсё менш нараджалася. У 1992 годзе памерла на 8% больш, чым нарадзілася, год пазней на 19,5%, а ў 1994 годзе — амаль 30%. Маладыя жанчыны баяліся нараджаць дзяцей. Такім чынам ужо ад 10 гадоў у дэмаграфіі Беларусі выступае вялікі спад. У апошнія гады колькасць грамадзян рэспублікі паменшылася на 100 тысяч. Чарнобыль яшчэ доўга будзе ўплываць на штодзённае жыццё Беларусі, хаця гэтага акурат зусім не ўсведамляе сабе большасць жыхароў краіны.

„Ніва" н-р 17 (2346) ад 29 красавіка 2001 г.

ЛЮД ХОЧА Ў РАСІЮ

Беларусь магла б быць даволі атракцыйнай краінай для турызму, асабліва суседнім народам. Чыстыя азёры на поўначы краіны, ціхія мястэчкі на Панямонні ці маляўнічыя краявіды над Прыпяццю маглі б задаволіць шмат якіх замежнікаў. Але перш за ўсё цана паслуг у беларускіх курортах несумненна найніжэйшая ў Еўропе. У гродзенскім курорце над самым Нёманам за 21 дзень разам з кватэрай, харчаваннем і лячэбнымі паслугамі патрабуюць толькі 150 долараў — утрая менш чым у Польшчы.

Аднак у Беларусь адпачываць ніхто ехаць не збіраецца. Сродкі масавай інфармацыі стварылі міф аб гэтай краіне, як надта беднай, бруднай, з разбітымі дарогамі і карумпаванымі міліцыянерамі. Хаця шмат абсурдаў выступае ў краіне, аднак няшмат там можна сустрэць з таго, аб чым можна прачытаць у варшаўскіх ці беластоцкіх газетах.

Савецкі люд хоча жыць у Расіі

Найбольшай асаблівасцю краіны з'яўляецца несумненна сам прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, герой большасці жартаў і народнай сатыры. Заўсёды выступае ён у падобнай ролі як міліцыянер пры Народнай Польшчы. Аднак — падказваюць мясцовыя інтэлектуалы — дастаткова паглядзець тэлепраграмы з удзелам прэзідэнта, каб быць удзельнікам спектакля чорнага гумару. Апошнім часам для прыхільнікаў інтэграцыі з Расіяй, сваіх найбольшых паклоннікаў стаў ён здраднікам ідэі яднання. Савецкі па менталітэце люд хоча жыць у Расіі. „А мне там всё равно в какой стране жить будем. Пусть долучают нас к России, Германии или Польши, только чтоб деньги за работу я получал", — гаварыў шафёр аўтобуса, які зведаў за рулём палову Еўропы. „А мне там всё равно кто будет с нами вместе — руский, белорус, поляк или еврей. Важное, чтобы человек был хорошим другом", — прагучала філасофія прадстаўніка беларускага люду.

Сотні гадоў эліты Беларусі будавалі „вместе с хорошими

друзьями" палітычны лад свае краіны — Вялікае княства Літоўскае, Рэч Паспалітую, Расійскую імперыю, Савецкі Саюз. Заўсёды былі „с кем то вместе". Сёння адны гісторыкі і літаратары хваляць Вялікае княства і Рэч Паспалітую, другія — Расію і Савецкі Саюз, як патрачаны рай на беларускай зямлі. І ніхто не звятрае нават увагі як жылося звычайным беларусам у райскіх эпохах. На пальцах рук можна палічыць інтэлектуалаў, якія прабуюць думаць катэгорыямі аўтаномнай Беларусі. Люд тутэйшы хоча інтэгравацца абы з кім, каб толькі „получать зарплату". Люд хоча служыць і выконваць загады, а нацыянальныя ідэі, якіх дзесяткамі гадоў шукае савецкая і постсавецкая інтэлігенцыя, цікавяць яго столькі, што мінулагодні снег.

Пацёмкінская вёска

1 верасня ў мястэчку Мір адбыліся агульнадзяржаўныя святкаванні пад назвай „Дні беларускага пісьменства". Пад славуты Мірскі замак прыехалі дзесяткі тысяч гасцей з усяе Беларусі. На галоўнай сцэне прамаўлялі прадстаўнікі прэзідэнта і ўрада, мітрапаліт Філарэт, выступалі народныя паэты. Побач амонаўцаў найважнейшых гасцей ахоўвала гвардыя ва уніформах з эпохі імператара Аляксандра І. Вакол замка праходзіла некалькі фэстаў у бэгэкатоўскім стылі. Увесь гарадок гучаў ад спеваў і танцаў. Паміж дрэвамі пякліся над агнём парасяты, казлы, цяляты і традыцыйныя шашлыкі. Прыгажуні ў вышываных вопратках прапанавалі булачкі, хлеб і ласункі з усіх рэгіёнаў Беларусі. Дзень быў спякотны, таму людзі выпілі возера піва і ўсялякай салодкай вады. Прадаваліся творы народнага мастацтва — вырабы з саломы, вышыванкі і маляванкі. Можна было набыць кніжкі на беларускай мове, нават пераклады твораў Міцкевіча і Дастаеўскага.

У цэнтры Міра ўсё пахла свежай фарбай. Як паінфармавала жыхарка гэтай мясовасці, апошнія будаўнічыя калектывы закончылі працу ў мястэчку на дзве гадзіны да пачатку святкавання. Працавалі дзень і ноч, калі з'явілася інфармацыя, што госцем у Міры будзе Аляксандр Лукашэнка. Імператар аднак не прыехаў. „Пацёмкінская вёска" — пракаментавала мясцовая настаўніца. На вуліцах агароджа аднолькавага кшталт-

ту і зялёна-жоўтага колеру, пастаўленая па загадзе адміністрацыі. Вуліца выглядала як вышываны арнамент вялікіх памераў, але падабалася насельніцтву.

Суседні Навагрудак быў адноўлены пару гадоў таму за кошт амаль мільёна долараў. Нагодай стала тады 200 гадавіна з дня нараджэння Адама Міцкевіча, якога шмат хто ў Беларусі лічыць беларускім паэтам. Сёння горад выглядае як мястэчка ў Баварыі.

Бедныя беларускія сяляне капаюць бульбу

Едучы сапраўды добрымі, але пуставатымі дарогамі Беларусі ў нядзельны дзень відаць на палях шмат людзей занятых капаннем бульбу. На загонах, побач мяшкоў, стаяць найчасцей „мерседэсы", „аўдзі", „фальксвагены". „Паглядзі, — сказаў іранічна калега з Гродна, — бедныя беларускія сяляне капаюць бульбу".

„Ніва" н-р 37 (2418) ад 15 верасня 2002 г.

KAMUNIKA.BY